Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 137 (4970)
ЧЭРВЕНЬ
24
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ У НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б — АБ ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАННЯ РАШЭННЯ МАЙСКАГА ПЛЕНУМА ЦК КП(б)Б ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ ХЛЕБАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ ПА СІСТЭМЕ ЗАГОТЗЯРНО.

ПАСТАНОВА ПАРТКАЛЕГІІ КАМІСІІ ПАРТЫЙНАГА КАНТРОЛЯ ПА БССР. — ПРА ПАРУШЭННЕ ПАСТАНОВЫ СНК СССР АД 5 ЛЮТАГА 1934 Г. АБ ПАРАДКУ ПЕРАВОЗАК ПАСЕЎНЫХ ГРУЗАЎ І АБ НЕЗАКОННЫМ ВЫДАТКАВАННІ ВОСТРАДЭФІЦЫТНАЙ КАБЕЛЬНАЙ ПРАДУКЦЫІ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — БРЫГАДЗІРЫ УЗНАЧАЛЬЦЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА МАС! **ЛЕЙЗЕР** — ЗА ЖАЛЕЗ ПАРТЫЙНУЮ І СОВЕЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ — СТАРАДАРОЖСКАЯ ЧУБАРАЎШЧЫН ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ.

САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ЗЛЁТА БРЫГАДЗІРАЎ.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ ГЕРОЯМ ССОВЕЦКАГА СОЮЗА І ЧЭЛ КІНЦАМ.

КІЕЎ—СТАЛІЦА СОВЕЦКАЙ УКРАІНЫ.

ВЫСТУПЛЕННЕ ГЕБЕЛЬСА СУПРОЦЬ ПАПЕН

ПРАВАКАТАРАМ ВАЙНЫ НЕ ЎДАСЦА НАХАВАЦЬ СОВЕ ПРАПАНОВЫ.

ПОСПЕХ СЕНАЎБОРКІ ВЫРАШАЮЦЬ:

ПОЎНАЯ НАГРУЗКА ТРАКТАРНЫХ І КОННЫХ КАСІЛАК, ШЫРОКАЕ ПРЫМЯНЕННЕ ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ЗДЗЕЛЬШЧЫНЫ, РАЗБІЎКА КАСЦОЎ НА ЗВЕ

БРЫГАДЗІРЫ, УЗНАЧАЛЬЦЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА МАС

Закончыў сваю работу злёт лепшых брыгадзіраў калгаснай Беларусі. У соцыялістычным спаборніцтве брыгадзіраў БССР на самыя перадавыя пазіцыі выйшлі ўдзельнікі гэтага злёта. Дастаткова было паслухаць брыгадзіраў, каб атрымаць яркае ўяўленне **аб брыгадзіры-ўдарніку, брыгадзіры-арганізатары мас.** Брыгадзір-ударнік— гэта такі брыгадзір, які адчувае сваю **адказнасць** за брыгаду, ажыццяўляе на справе **адзінаначалле.** Брыгадзір-ударнік—гэта такі брыгадзір, які працуе **планава.** Калі прыйшла сяўба, то яго брыгада **мае чоткі календарны план сяўбы.** Калі прыйшла ўборка, то яна не застала знянацку брыгаду—брыгада ведае **загадзя,** што яна будзе рабіць і **ў першы і ў апошні** дзень уборкі.

Брыгадзір-ударнік — гэта такі брыгадзір, які ведае дасканальна **гаспадарку, зямлю, коней, людзей** сваёй брыгады. Ён ведае думы і характар кожнага калгасніка. Вось гэты добры—на касьбе, а той—больш за ўсё любіць працаваць канёй. Вось гэты—лепшы ўдарнік, а той—з лянцой. Адпаведна — і расстаноўка людзей і іх выхаванне. Брыгадзір-ударнік ведае кожны кавалак зямлі сваёй брыгады, **гісторыю яе палёў. Ён першы ўдарнік у барацьбе за агратэхніку,** ён вывучае насенне, севазварот і т. д. Брыгадзір-ударнік, падбіраючы ў конюхі лепшых ударнікаў, сам ведае коней сваёй брыгады **не горш конюха-ўдарніка. Ён кожны** дзень правярае коней, і гора таму, хто не пачысціць свайго каня, ці тым больш загоніць яго.

Брыгадзір-ударнік — клапатлівы гаспадар калгасных **машын.** Ён дзесяць раз праверыць гатоўнасць жняяркі, малатарні, касілкі. Яшчэ не паспела скончыцца сяўба, а ў яго ўжо адрамантаваны ўборачныя машыны. Брыгадзір-ударнік **любіць** машыну. Ён — **першы дарадчык** трактарыста, малацьбіта. Брыгадзір-ударнік—гэта такі брыгадзір, у якога **жалезная дысцыпліна** ў брыгадзе сталучаецца з **актыўным удзелам** усёй брыгады ў абмеркаванні і вялікіх і малых спраў. Такі брыгадзір не дапусціць нягуважлівага спазнення на работу або гультайства на рабоце. Ён увесь час праводзіць работу на полі. Ён не сядзіць на прызбе або ў калгаснай канцылярыі і не чэша язык. Не. Яго заўсёды сустрэнеш па тым або іншым участку поля. Вось чаму ў яго брыгадзе амаль няма агрохаў, вось чаму ў яго не можа быць выпадку, каб сяўба затрымалася на 3-4 гадзіны з-за непадвозу насення, каб людзі прастаялі з-за няведання свайго ўчастка работы. Ударнік-брыгадзір апіраецца на **актыў** брыгады, але ў яго няма сямейных адносін, ён рэжа «праўду-матку» кожнаму, хто дрэнна працуе, хто не дбае аб калгасных інтарэсах. У брыгадзіра-ўдарніка ўзорна пастаўлен **учот.** Уся гаспадарка брыгады ў яго на ўчоце. Ён **штодзенна** ўлічвае працу калгаснікаў, бо ведае, што без штодзеннага ўчоту няма праверкі выканання, няма сапраўднага соцспаборніцтва.

Брыгадзір-ударнік—**першы арганізатар усякіх агратэхнічных новаўвядзенняў, усякіх пачынанняў у справе арганізацыі працы.** Ці прымяніць новую машыну, ці палепшыць насенны матэрыял, ці арганізаваць аграгурток, ці скарыстаць касу ў дапамогу жняярцы, ці ўвесці, дзе гэта патрэбна і мэтазгодна, індывідуальную здзельшчыну—заўсёды брыгадзір-ударнік **першым** адгукаецца на мерапрыемствы партыі і ўрада.

Брыгадзір-ударнік — гэта, нарэшце, такі брыгадзір, які з'яўляецца не толькі арганізатарам гаспадаркі, але і **палітычным** кіраўніком брыгады. На **штодзенных выторчых нарадах** ён выхоўвае брыгаду ў духу рашэнняў партыі, у духу пістарычных указанняў правадыра партыі. Ён сам чытае сваёй брыгадзе газету або арганізуе (у перапынку) чытку. Брыгадзір-ударнік — **арганізатар соцспаборніцтва і ўдарніцтва.** У яго ў брыгадзе штодзенна красуецца **дошка тэмпаў або чорная і чырвоная дошка.** У яго ў брыгадзе амаль кожны калгаснік і калгасніца ахоплены дагаворамі соцспаборніцтва.

Такі брыгадзір-ударнік. Такіх брыгадзіраў мы маем ужо многа сотень. Трэба каб іх былі **тысячы.**

Таварышы-брыгадзіры! Абмяркоўвайце самаабавязацельствы злёта брыгадзіраў! Следуйце прыкладу брыгадзіраў-ударнікаў. Уступайце ў соцспаборніцтва! **Арганізуйце соцспаборніцтва ў вашых брыгадах.** Біцеся за права быць занесенымі на ўсебеларускую дошку гонару! Біцеся за гонар, каб ваша брыгада была лепшай у БССР!

ЗДАЧА СЕНА ДЗЯРЖАВЕ— ПЕРШАЯ ЗАПАВЕДЗЬ КАЛГАСНІКА

— КАЛГАСЫ І АДНААСОБНІКІ! СЛЕДУЙЦЕ ПРЫКЛАДУ — ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ, ЗДАВАЙЦЕ СЕНА ДЗЯРЖАВЕ, ЗВОЗЯЧЫ ЯГО ПРАМА З ПОЛЯ

ДАЦЬ АДПОР АНТЫМЕХАНІЗАТАРСКІМ НАСТРОЯМ НА СЕНАЖАЦЯХ

ПОЛАЦК. (Карэспандэнт «Звязды»).

13 чэрвеня калгас імя Сталіна, Юравіцкага сельсавета, адным з першых у раёне пачаў сенаўборку. За першыя 4 дні работы на сенажаці скошана больш за 50 гектараў.

Першыя поспехі калгаса на сенаўборцы тлумачацца правільнай арганізацыяй працы і расстаноўкай людзей. Да выхаду на сенажаць 32 касцы былі разбіты па звеннях па 3 чалавекі ў кожным. Самае вялікае звяно — 4 чалавекі. **У звеннях устаноўлена індывідуальная здзельшчына.** Норма выпрацоўкі на працадзень — 0,40 гектара.

Увечары пасля першага дня работы старшыня калгаса тав. Берабін, абмераўшы плошчу, скошаную за дзень, заявіў, што ў звяне Плаўкова кожны скасіў 0,52 гектара, у Гайдукова — 0,48. Звенні Сураёва і Чачуры не выканалі норм, яны скасілі 0,36 гектара. На заўтра і гэтыя звенні падцягнуліся. Нормы перавыконваюцца.

Па раёну трэба ўбраць 39.700 гектараў заліўных сенажацей. За пяцідзеўку з 10 па 15 чэрвеня скошана толькі 367 гектараў па калгасах і 80 гектараў па аднаасобных гаспадарках. 16 і 17 чэрвеня рэзкага пералому не далі.

Да касьбы яшчэ не прыступілі калгасы Салоніцкага і Замшанскага сельсветаў, і толькі ў двух сельсветах праводзяць сенаўборку аднаасобнікі.

Але і тыя калгасы, якія прыступілі да касьбы, арганізавалі работу так, што сенаўборка можа зацягнуцца да 20 ліпеня. Так, калгас «Ленінскі прамень», Руднянскага сельсавета, скасіў усяго 2 гектары. Калгас «Другая большэвіцкая вясна», Алесаўскага сельсавета, працуе побач з калгасам імя Сталіна на адным і тым-жа лузе. Касцоў амаль столькі-ж. Калгаснікі калгаса імя Сталіна скошваюць у дзень 16 гектараў, а ў «Другой большэвіцкай вясне»— 4 гектары. Розніца толькі ў тым, што тут работа арганізавана на прынцыпу індывідуальнай здзельшчыны, а ў калгасе «Другая большэвіцкая вясна» **няма** ніякай здзельшчыны.

Другая не менш важная прычына адставання раёнаў — гэта нежаданне і ў паасобных выпадках нават сабатаж механізаванай сенаўборкі. З 172 сенакасілак працуюць толькі адзінкі. Праехаўшы па Махіраўскаму, Бельскаму, Замшанскаму і Кушлякоўскаму сельсветах, мы не ўбачылі на сенажаці ніводнай сенакасілкі. У калгасах гэтых сельсветаў ёсць больш за 70 сенакасілак. На сенаўборцы не выкарыстаны таксама і трактарныя сенакасілкі. Дырэктар Полацкай МТС тав. **Рэйнікаў** нават не падумаў скарыстаць 6 трактарных сенакасілак, якія стаяць без работы на складзе.

Антымеханізатарскія тэндэнцыі не атрымліваюць адпору з боку раённых арганізацый.

Большасць сенажацей у Полацку— балотныя. Асака ўжо адцвітае. Кожны дзень адцяжкі касьбы змяншае кармовую базу.

Штодзенна на сенажацях бываюць работнікі райкома, палітадзела. Няўжо яны гэтага не бачаць?

НЕЙДЛІН.

ВЕСТКІ З СЕНАЖАЦЯЙ

БАРЫСАЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Перадавыя калгасы раёна па-ўдарнаму праводзяць сенаўборку. Калгас «Іскра соцыялізма» скасіў 50 гектараў сенажаці, што складае 77 проц агульнай плошчы.

Для лепшага абслугоўвання брыгад на сенажаці арганізован спецыяльны стан, у якім касцы адпачываюць і харчуюцца.

Калгас імя Леніна — напярэдадні поўнага завяршэння сенаўборкі. Сена ўжо высушана і складзена ў стагі.

Калгас «Чырвоная змена» па соцдагавору абавязаўся да 1-га ліпеня скончыць сенаўборку, а да 21-га чэрвеня здаць сена дзяржаве.

Сена добрай якасці здае дзяржаве калгас «Ударнік», Жартайскага сельсавета. Сеназдача пачалася з 10 чэрвеня. У першы дзень здана 700 кгр.

У сувязі з разгортваннем сенаўборачных работ і сеназдачы дзяржаве 5 аднаасобных гаспадарак вёскі Хонава, Жартайскага сельсавета, уступілі ў калгас.

ХОД ПРАПОЛКІ, УЗДЫМУ ЦАЛІНЫ І ПАПАРУ І СЕНАЎБОРКІ ПА БССР НА 20 ЧЭРВЕНЯ 1934 ГОДА

РАЁНЫ	Прапалата ў проц. Ільну	Прапалата ў проц. Зярнавых	Папараў	Узнята ў проц. Цаліны	Скошана сена
1. Барысаўскі	100,0	100,0	116,0	101,6	21,6
2. Менскі	100,0	100,0	101,9	100,4	31,2
3. Любаньскі	100,0	100,0	100,0	91,9	32,8
4. Аршанскі	100,0	100,0	100,9	93,2	21,7
5. Сіроцінскі	100,0	100,0	105,6	89,1	17,7
6. Бешанковіцкі	100,0	100,0	94,1	87,4	15,7
7. Лагойскі	100,0	100,0	103,1	114,2	10,2
8. Чэрыкаўскі	100,0	100,0	81,7	100,0	13,5
9. Бягомльскі	100,0	100,0	63,3	99,4	17,2
10. Б.-Кашалёўскі	100,0	100,0	50,9	98,9	7,5
11. Смалявіцкі	99,4	100,0	63,2	94,8	3,7
12. Магілеўскі	100,0	100,0	101,0	89,9	5,9
13. Тураўскі	100,0	100,0	89,5	88,0	23,9
14. Прапойскі	100,0	100,0	90,8	85,5	4,4
15. Бярэзінскі	100,0	100,0	103,8	75,2	8,6
16. Шклоўскі	100,0	100,0	80,5	74,9	2,5
17. Слуцкі	100,0	100,0	22,9	74,8	39,7
18. Дзяржынскі	97,2	100,0	58,1	73,5	10,2
19. Глускі	97,5	100,0	103,9	92,1	5,8
20. Бялыніцкі	100,0	100,0	104,8	68,9	9,5
21. Веткаўскі	91,8	100,0	35,7	68,9	10,8
22. Бабруйскі	100,0	100,0	75,2	68,2	2,9
23. Петрыкаўскі	95,4	100,0	21,4	68,2	18,8
24. Асвейскі	100,0	100,0	73,7	67,0	7,5
25. Клімавіцкі	100,0	100,0	113,7	63,8	8,4
26. Крупскі	100,0	100,0	70,3	63,7	6,2
27. Быхаўскі	100,0	100,0	79,1	63,6	1,5
28. Плешчаніцкі	94,1	100,0	114,5	62,8	4,7
29. Ч.-Слабодскі	100,0	100,0	55,9	62,5	60,4
30. Ельскі	100,0	100,0	39,0	62,3	27,2
31. Пухавіцкі	100,0	100,0	54,5	61,3	10,5
32. Жлобінскі	100,0	100,0	38,3	61,2	10,1
33. Чырвонапольскі	100,0	100,0	71,4	60,9	2,2
34. Расонскі	100,0	100,0	53,1	59,7	3,7
35. Парыцкі	95,3	100,0	58,3	58,9	12,5
36. Касцюковіцкі	100,0	100,0	56,1	57,3	9,2
37. Чачэрскі	100,0	100,0	52,9	56,0	5,6
38. Полацкі	100,0	100,0	54,3	55,3	5,0
39. Рагачоўскі	100,0	100,0	87,6	54,0	2,8
40. Суражскі	100,0	100,0	78,5	53,7	0,8
41. Лёзненскі	100,0	100,0	55,3	53,3	12,9
42. Уздзенскі	100,0	100,0	16,0	53,2	25,8
43. Хойніцкі	84,9	100,0	41,3	53,1	36,5
44. Стара-Дарожскі	100,0	100,0	5[illegible],0	52,1	3,1
45. Віцебскі	100,0	100,0	3[illegible],3	49,9	5,2
46. Чавускі	100,0	100,0	99,0	49,8	46,7
47. Дрысенскі	100,0	100,0	7[illegible],7	48,8	10,6
48. Гарадоцкі	100,0	100,0	50,1	48,1	6,3
49. Уваравіцкі	100,0	100,0	49,6	48,1	8,2
50. Рэчыцкі	92,1	100,0	59,7	47,0	12,7
51. Гомельскі	100,0	100,0	66,9	46,3	8,3
52. Мазырскі	96,0	106,1	30,0	44,9	21,7
53. Камарынскі	100,0	108,5	15[illegible]	44,8	26,4
54. Церахаўскі	89,9	100,0	27,2	43,8	22,5
55. Клічаўскі	100,0	100,0	8[illegible],6	41,9	12,9
56. Дубровенскі	100,0	100,0	5[illegible],2	41,7	4,0
57. Капыльскі	100,0	105,1	63,9	40,9	30,2
58. Чашніцкі	100,0	100,0	86,1	37,1	6,4
59. Заслаўскі	100,0	100,0	45,0	37,8	5,1
60. Лепельскі	100,0	100,0	55,0	36,9	7,6
61. Сенненскі	100,0	100,0	[illegible]	36,1	10,4
62. Старобінскі	100,0	100,0	17,7	35,4	32,8
63. Кармянскі	100,0	100,0	31,5	34,4	8,4
64. Жыткавіцкі	99,1	100,0	55,0	34,3	22,9
65. Талачынскі	100,0	100,0	73,4	30,0	4,6
66. Нараўлянскі	100,0	97,4	55,1	52,8	21,4
67. Мсціслаўскі	100,0	92,3	105,5	43,0	11,2
68. Чэрвеньскі	93,6	100,0	63,4	21,7	4,2
69. Ушацкі	100,0	99,6	39,6	35,9	7,0
70. Брагінскі	98,5	93,6	30,9	27,3	22,5
71. Лельчыцкі	100,0	86,9	24,5	66,0	21,6
72. Лоеўскі	98,8	81,9	25,1	72,5	10,3
73. Крычаўскі	97,7	100,0	40,1	27,5	13,3
74. Асіпавіцкі	91,9	100,0	8,3	30,4	0,2
75. Горацкі	100,0	100,0	47,9	18,9	3,3
Усяго па БССР	100,0	100,0	69,6	59,5	13,1

САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ЗЛЁТА БРЫГАДЗІРАЎ

Мы, перадавыя брыгадзіры калгаснай Беларусі, сабраўшыся на ўсебеларускі злёт, уключаемся ў рэспубліканскае спаборніцтва брыгадзіраў на лепшае правядзенне ўборачнай без страт; на дэтэрміноване выкананне сельска-гаспадарчых паставак; на выкананне рашэнняў XVII з'езда па жывёлагадоўлі; на правядзенне ў жыццё вялікага позынга нашага правадыра — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Мы абавязваемся:

Дасканала праверыць нашы палі, правёўшы дадатковую праполку ільну, яравых, зернавых і агародніх і вкучванне бульбы на засмечаных участках.

Поўнасцю закончыць сенаўборку да пачатку ўборкі зернавых, своечасова звезці сена ў пуні і здаць яго дзяржаве ў адпаведнасці з кантрактацыяй не пазней 15 ліпеня.

Пачаць уборку выбарачным парадкам, не чакаючы паспявання ўсёй плошчы. Добра падрыхтаваць нашы жняркі, не дапусціць ні адной гадзіны іх прастою. Дабіцца, каб кожная жняярка ўбірала не менш 5,5—6 гектараў у суткі. У дапамогу жняярцы падрыхтуем касу, каб убраць азімыя за 5 дзён, яравыя таксама.

Поўнасцю ліквідаваць ураўнілаўку і метад работы «скопам», прымяняючы дробна-групавую і індывідуальную здзельшчыну.

Малацьбу пачаць, не чакаючы скончэння ўборкі, з тым, каб хлебаздачу пачаць яшчэ у ліпені і закончыць яе ў верасні. У малацьбе галоўнай сваёй задачай ставім 100-процантнае выкарыстанне складаных і поўскладаных малатарань і не дапушчэнне рассыпкі зярна.

Не дапусцім паўтарэння памылак мінулых год з ільном — своечасова яго выцерабім, праводзячы сартаванне пры церабленні; не дапусцім разрыву паміж церабленнем, абмалотам і рассцілам, ні на адзін дзень не замарудзім падняцце ільну са сцеліш. Захаваем усе правілы пры апрацоўцы ільну, у прыватнасці адлежку, каля сушкі і мяцця: шырока выкарыстаем машыны пры ўборцы і апрацоўцы ільну (ільноцерабілку, машыну Гільштэйна, «Эддзі», чыгунную ільномялку, трапальнае кола).

Здамо дзяржаве трасту не ніжэй нумара 1,5, валакно не ніжэй нумара 10.

У кожнай ільнаводчай брыгадзе вылучым адказнага за лён.

Паставім у цэнтр нашай работы барацьбу за якасць, за захаванне ўраджаю; забяспечым актыўную работу камісій па якасці, арганізацыю вышак і вылучэнне аб'езчыкаў, прыняўшы неабходныя супрацьпажарныя меры; уцягнем у гэту справу піонераў, прыцягваючы іх да дазораў ураджаю, да збяражэння калосаў; адрамантуем пуні і свірны.

Першымі па БССР выканаем пастаўкі: сена—прама з сенажаці, хлеб здаць з-пад малатарні, бульбу—з поля ў вагон; трасту—з поля на ільназавод. І на прадукцыя будзе лепшай і па якасці.

Да 1 ліпеня закончым злучную кампанію, забяспечым 100-процантнае захаванне мападняка, даб'емся каб не было ні аднаго каня ніжэй сярэдняй упітанасці, каб наша жывёла была поўнасцю забяспечана і грубымі, і канцэнтраванымі кармамі. Абавязваемся перавыканаць план сілаваня, забяспечыць пашырэнне жывёлагадоўлі і ў калгаснікаў,—каб яны больш гадавалі свіней, авечак, гусей, качак, курэй.

Мы, перадавыя брыгадзіры, абавязваемся ісці ўперадзе не толькі па сельска-гаспадарчых работах, але і па ўсіх участках нашай соцыялістычнай будоўлі—быць першымі па паляпшэнню дарог, асабліва каля здатачных пунктаў, па забяспячэнню нашых школ дровамі, па мабілізацыі сродкаў, выкананню нашымі калгаснікамі плана здачы малака, мясапаставак і песавывазкі і т. д.

Мы, перадавыя брыгадзіры калгаснай Беларусі, уступаючы ў соцспаборніцтва, абавязваемся шырока арганізаваць соцспаборніцтва паміж звеннямі і паміж асобнымі калгаснікамі і калгасніцамі нашых брыгад. Абавязваемся весці штодзённа растлумачальную работу, дапамагаючы выпуску брыгаднай газеты. Забяспечым штодзённае вывешванне чырвонай і чорнай дошак, рэгулярнае прэміраванне лепшых ударнікаў і ўдарніц.

Мы, перадавыя брыгадзіры калгаснай Беларусі, абавязваемся ўцягнуць у соцспаборніцтва другіх брыгадзіраў нашых і суседніх калгасаў, з тым, каб сцяг ленінскага соцспаборніцтва палыхаў над кожным калгасам, полем, каб наша Совецкая Беларусь дабілася гонару атрымаць вышэйшую ўзнагароду—Ордэн Леніна.

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАША КОМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ БЕЛАРУСІ І ЕЕ БАЯВЫ КІРАЎНІК ТАВ. ГІКА

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАША РОДНАЯ ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ [illegible] МУДРЫ СТАЛІН!

ЛІНЧУК КСЕНЯ, КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» (ЛОЕЎСКІ Р.).

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

(на 20 чэрвеня 1934 г.)

	БССР (у проц.)	Зах. воб (у проц
Прапалата ільну	100,0	65
Прапалата зернавых	100,0	62
Узнята папару	69,6	84
Узнята цаліны	59,5	30
Скошана сена	13,1	5

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Пераходны сцяг ЦК і СНК па зернавой зоне пакінуць за Б саўскім раёнам. Папярэдзіць кіраўніцтва раёна, што калі раён не цягнецца па ўборцы і здачы сена, сцяг будзе перадан **Менскаму** р

Кандыдатамі на атрыманне пераходнага сцяга залічыць **Менскі, баньскі, Аршанскі і Чэрыкаўскі** раёны.

Зняць з кандыдатаў на атрыманне чырвонага сцяга **Магілеўс Прапойскі** раёны, якія адстаюць па ўзняццю цаліны і ўборцы сена.

Указаць кіраўніцтву Лагойскага раёна, што ліквідаваўшы адст не па ўборцы сена, раён можа паставіць сябе ў рады **кандыдатаў** атрыманне чырвонага сцяга.

Па ільнаводчай зоне сцяг ЦК і СНК перадаць **Сіроцінскаму** р адабраўшы яго ад Сенненскага раёна, які за апошні час некалькі тэмпы па падняццю цаліны і ўборцы сена.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга залічыць **Бешанковіцкі і Се скі** раёны.

За ганебныя тэмпы ў правядзенні праполкі, уздыму папараў, ны і сенаўборкі, пакінуць на чорнай дошцы **Горацкі, Асіпавіцкі і чаўскі** раёны. Дадаткова занесці **Чэрвеньскі і Ушацкі** раёны. —

Зняць з чорнай дошкі **Нараўлянскі і Пухавіцкі** раёны, папярэдз апошні аб неабходнасці ліквідацыі адставання па ўборцы сена.

Цэнтральная камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю ў ар раз папярэджвае **Горацкі, Асіпавіцкі і Крычаўскі** раёны аб тым, калі яны ў наступную пяцідзеўку не ліквідуюць свайго адставання дзе паднята пытанне перад Бюро ЦК аб абследванні гэтых раёнаў.

Кандыдатамі на чорную дошку вызначыць **Брагінскі Лоеўскі, чынскі і Мсціслаўскі** раёны.

Папярэдзіць кіраўніцтва **Жытковіцкага, Заслаўскага, Лельчыц Старобінскага і Лепельскага** (астатніх двух у апошні раз) аб неад насці ліквідаваць адставанне па ўсіх асноўных праводзімых з сельскагаспадарчых кампаніях.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За паспяховае правядзенне чарговых мера прыемстваў па барацьбе за ўраджай пастанова Цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходня вобласцю заносяцца на чырвоную дошку наступ ныя раёны:

БАРЫСАЎСКІ (сакратар РК т. Чарнышоў, стар шыня РВК т. Баранчык);

МЕНСКІ (сакратар гаркома т. Рыскін, стар шыня горсовета т. Жуковіч);

ЛЮБАНЬСКІ (сакратар РК т. Кардаш, стар шыня райвыканкома т. Клімаў);

АРШАНСКІ (сакратар РК т. Соскін, старшын РВК т. Міцькоў);

ЧЭРЫКАЎСКІ (сакратар РК т. Кац, старшын РВК т. Ратайко);

СІРОЦІНСКІ (сакратар РК т. Ляхаў, старшын РВК т. Барсукевіч);

БЕШАНКОВІЦКІ (сакратар РК т. Каждан, стар шыня РВК т. Грышчанка).

СЕННЕНСКІ (нам. сакратара РК т. Каўзунова старшыня РВК т. Качук);

ЧОРНАЯ ДОШКА

За ганебны зрыў чарговых мерапрыемстваў па ба рацьбе за ўраджай заносяцца на чорную дошку наступ ныя раёны:

ГОРАЦКІ (сакратар РК Вільчак, старшыня РВК Лабанаў);

АСІПАВІЦКІ (сакратар РК Новікаў, старшыня РВК Млодзік);

КРЫЧАЎСКІ (старшыня РВК Зябкін);

ЧЭРВЕНЬСКІ (сакратар РК Васільева, старшыня РВК Бушман);

УШАЦКІ (сакратар РК Тарасовіч, старшыня РВК Лясовіч).

НОВАЯ ІЛЬНАЦЕРАБІЛКА

ЛЮБЕРЦЫ, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). У калгасе **«Красный партизан»** у палявых умовах адбываюцца выпрабаванні шыроказахватнай ільнацерабілкі **«ВНИЛ-5»**, нядаўна асвоеная Любярэцкім заводам. Атрыманыя з калгаса весткі сведчаць, што ільнацерабілка бліскуча вытрымала выпрабаванне. Яе прадукцыйнасць у рабочы дзень—5 гектараў—у 3-4 разы большая, чым у вуз захватнай церабілцы **«Комсамолк** якую завод раней выпускаў. Каэ цыент карыснай работы новай шыны—75, чыстата церабленн 99,8 проц.

Любярэцкі завод выпусціць к у рачнай кампаніі 2 тыс. новых шын. Ужо выпушчана 450 ноў ільнацерабілак.

Брыгадзіры! Арганізуйце і узначальце соцыялістычнае спаборніцтва калгасных мас!

АБМЯНЯУШЫСЯ ВОПЫТАМ—ЗА БАЯВУЮ РАБОТУ

...шныя брыгадзіры калгасаў, ...ўшыся на ўсебеларускі злёт, ...ліся вопытам правядзення ..., праполкі і падрыхтоўкі да ...чнай, паставак дзяржаве.

...вялікую вышыню ўзняўся ...сны брыгадзір—цэнтральная ...а ў калгаснай вытворчасці. ...ае выступленне дэлегата—гэ... ...ераканаўчы доказ таго, што

...РАХАЎ КЛІМ, КАЛГАС «ГІ...Г» (ЧЭРЫКАЎСКІ Р.).

...адзіры ўжо ў час веснавой ...ы правялі сябе сапраўднымі ...нізатарамі, адзінаначальнікамі ...ыгадзе.

...ерш-на-перш на вышэйшую ...ень узнялася арганізацыя пра... ...узнялася яе прадукцыйнасць. ...ыгадзір тав. Серы з калгаса ...іч», Капыльскага раёна, гаво... ...ь аб увядзенні індывідуальнай ...льчыны на прапорцы:

...Калі ў часе сяўбы 27 жалчын ... разбіты на тры звенні, то на ...юлцы я іх разбіў на 7 звенняў ...ставіў па ўсіх кутках. Гэта на ...і дзень падвоіла прадукцый... ...ь працы. Калі раней 19 жан... ...праполвалі 0,47 гектара за ...ь, то пры індывідуальнай ...льчыне—1,40 гект.

...ое-ж на капанні канаў. У пер... ...дзень «скопам» тры звенні — ...чалавек—выкапалі 96 метраў, ...расстаноўкі на аснове інды... ...альнай здзельшчыны тыя-ж ...зі выкапалі за дзень 246 мет...

...б гэтым-жа гаворыць і брыга... ...т. Рылько (Смалявічы).

...— На ворыве была спачатку ...ка 0,50 гектара на параконны ...г. З нацяжкай выконвалі пор... ...Мы пераканаліся, што гэта ...ка малаватая, павялічылі к... ...гект. Увялі індывідуальную ...льчыну. І што-ж? Сталі ўзор... ...каля.., 0,80 гектара на пару ...ей.

...олькі не ўсе брыгадзіры яшчэ ...каналіся ў вялікай важнасці ...нізацыі працы на аснове інды... ...альнай здзельшчыны. Некато... ...заяўляюць:

...— Брыгадзір не паспее ўсім ...ь нарад, расставіць па ўчаст... ...Улік будзе кульгаць. Якасць ...праверыш.

...эта—несур'ёзныя «аргументы». ...відуальная здзельшчына не ад... ...яе звенняй арганізацыі пра... ...наадварот, патрабуе ўмаца... ...ня звяна, унутры якога право... ...ца работа на аснове індывідуа... ...най здзельшчыны. Вывад такі: ...відуальную здзельшчыну ў ...е трэба шырока практыкаваць ... радзе ўборачных работ.

...Шмат гаварылі брыгадзіры аб ...рыхтоўцы да ўборкі машын— ...нарак, касілак, грабель. Паводле ...лоў—усё спраўна, усё падрых... ...зана, у парадку. Абязлічка да...

...тав. Казак (Калгас імя Першай ...най, Менскі раён) з гонарам за... ...ў:

...— Аб рабоце машын і замацаг... ...ні інвентара я наогул лічу ...нім гаварыць. Гэта ўжо ўста... ...а. Прымацаванне зроблена даў...

...ЕЛІКАЎ ЦІХАН, КАЛГАС «УДАР...НІК». (МАГІЛЕЎСКІ Р.).

...но. У нашым калгасе прымацавалі да кожнага нават пугу. Папрабуй узяць чужую пугу—скандал падымецца. Усё адрамантавана, усё гатова да ўборкі.

Усё гэта вельмі добра. Але ці варта так самасупакойвацца. Аднымі машынамі мы не паспеем своечасова, без страт убраць ураджай. На дапамогу жнярцы патрэбна скарыстаць касу. Як рыхтуюцца косы да ўборкі зернавых? Ці робяцца дужкі, грабелькі?

На жаль, толькі нямногія брыгадзіры на гэтыя пытанні маглі адказаць станоўча. Не рыхтуюцца яшчэ косы да жніва.

А між тым, каса ўжо ў мінулым годзе ва многіх калгасах паказала, што толькі пры яе дапамозе можна ўбраць увесь ураджай поўнасцю, своечасова, без страт, не дапусціўшы перастою збожжа на корані.

Тав. Прахарэнка з калгаса «Перамога», Гарадоцкага раёна, гаворыць:

— У мяне летась збожжа касілі косамі вельмі добра, ніякай шкоды не было. Жанчыны падбіралі і вязалі, астатнія на ільне працавалі. Сёлета будзем абавязкова касіць косамі.

Брыгадзір Церахаў (Чэрыкаўскі раён) таксама падтрымлівае дужку т. Прахарэнкі:

— Наша брыгада не прымяняла кос. Я гэта пытанне падняў у сваёй брыгадзе, калі мы абгаварвалі пісьмо т. Гікало аб захаванні ўраджаю. Адзін калгаснік, які быў у палоне ў Германіі, гаварыў, што гэты метад там прымяняецца і дае добрыя вынікі. Я яму і даручыў прыстасаваць косы. Цяпер мы косім жыта. І добра выходзіць.

Вывад адзін: косы, як галоўную дапамогу жнярцы, трэба абавязкова прымяняць на ўборцы ўраджаю.

— З'явіліся ўжо на калгасных палях кулацкія «парыкмахеры». Зярно яшчэ не налілося, але кулак прабуе шкодзіць, зразаючы зялёныя каласы. Мы цяпер паставілі вартаўнікоў. Пільна ахоўваем ураджай,—сказаў т. Серы, брыгадзір калгаса «Ільіч», Капыльскага раёна.

Гэты сігнал—сур'ёзнае папярэджанне для ўсіх брыгадзіраў, усіх калгасаў. Не трэба чакаць поўнага паспявання ўраджаю, не-



...ЛУГІН ІГНАТ, КАЛГАС «СЕРП І МОЛАТ» (ГЛУСКІ р.).

адкладна трэба паладзіць ахову збожжа на корані.

Значную ўвагу аддалі брыгадзіры ў сваіх выступленнях масавай рабоце. І гэта зусім правільна, бо толькі палітычна-масавая работа з калгаснікамі і калгасніцамі можа забяспечыць баявыя тэмпы работы, можа ўзняць соцспаборніцтва яшчэ на вышэйшую ступень.

Тав. Лагун з калгаса «Большэвік», Чырвона-Слабодскага раёна, перадае вопыт правядзення масавай работы ў брыгадзе.

У кожным звяне ёсць чытчык газеты. Штодзенна праводзяцца кароценькія вытворчыя нарады, у якіх прымаюць удзел інспектары па якасці, ударнікі, звеннявыя. Штодзенна выпускаецца насценгазета. Рэдактар — комсамолец. Ёсць дошка тэмпаў, дзе нарысаваны самалёт, аўтамабіль, чарапаха. Гэта дошка робіць вялікі ўплыў на людзей, якія ляніуюцца.

— Мы зрабілі дошку, па якой тры колеры: чырвоны, сіні, чорны. Кожны дзень на чырвоную дошку заносім калгаснікаў і калгасніц, якія перавыконваюць нормы, даюць высокую якасць; на сінюю—якія выконваюць нормы; на чорную—зрыўшчыкаў заданняў, гультаёў—гаворыць т. Ганчароў (Лёзненскі раён).

Тав. Сураўёў з калгаса імя Сталіна-II, Полацкага раёна, перадае свой вопыт:

— У мінулым годзе палітаддзел мяне прэміраваў за работу ў газеце. Працую я так: у часе перапынку мы выбіраем артыкулы з газеты найбольш цікавыя. Калгаснікі самі патрабуюць такіх артыкулаў, дзе пішацца аб калгасах. Кожны калгаснік імкнецца да таго, каб напісалі ў газеце пра наш калгас, што ён добра працуе, што кулацкая работа ў нас не праводзіцца, а раней было шмат кулакоў. Мы іх выжылі і зараз узорны наш калгас.

Самому брыгадзіру быць чытчыкам—гэта самая добрая справа. Брыгадзір увесь час на полі, з калгаснікамі знаходзіцца, можа ў любы час праводзіць чытку газет. У нас кожны дзень праводзяцца вытворчыя нарады, і кожны калгаснік ведае, што ён павінен зрабіць заўтра. У часе пасеўнай кампаніі ў нас выходзілі на работу ў 5 гадзін раніцы, а часамі і раней.

Ці варта пасля гэтых прыкладаў гаварыць, што масавая работа —

СУРАЎЕЎ ПЕТРА, КАЛГАС СТАЛІНА (ПОЛАЦКІ Р.).

рашаючы фактар. Правільная арганізацыя працы, шырокае разгортванне масавай палітычнай работы забяспечыць нам своечасовую ўборку ўсяго ўраджаю, без страт.

Аднак, ужо зараз трэба звярнуць увагу на такія важнейшыя моманты агратэхнікі правядзення ўраджаю. На злёце асобныя брыгадзіры (т. Прахарэнка—Гарадок і інш.) заявілі аб тым, што пры цераблені не трэба сартаваць лён. Ці так гэта? Калгасныя майстры соцыялістычнага ільнаводства нядаўна ў «Зеяздзе» дакладна адказалі на гэтае пытанне: так, трэба сартаваць. І не толькі яны так сказалі. Вось брыгадзір Ганчароў (Лёзна), успамінаючы горкі леташні вопыт, гаворыць:

— Калгаснікі на чале са мной, брыгадзірам, думаюць убраць 7 га ільну з такім разлікам, каб на полі адразу і сартаваць, бо вопыт мінулага года паказаў, што не робячы ў часе ўборкі на полі сартавання, мы псавалі прадукцыю ільнавалакна. Зараз мы думаем адразу на полі адбіраць лён. У часе ўборкі думаем адразу прыступіць да абмалоту машынай «Эдзі». Гэта простая машына, зробленая самімі калгаснікамі. Потым у часе цераблення і здачы дзяржаве адразу будзе відаць нумарацыя ільну.

Спрэчак тут быць не можа. Вопыт лепшых калгасаў пераканаўча даказаў, што сартаванне ільну рашае поспех барацьбы за высокую якасць ільну:

Зразумела, своечасовая ўборка ільну — аснова асноў.

Уборка зернавых. Выступаўшыя таварышы звычайна гаварылі так: гатовы, правядзем уборку за 7-8-12 дзён і т. д.

Аднак, мы павінны адзначыць, што ні адзін брыгадзір не мог расказаць злёту аб дакладным, прадуманым, канкрэтным плане ўборкі, спалучэнні ўсіх сельска-гаспадарчых работ летня-асенняга перыяда.

Па-ранейшаму яшчэ пануе «планаванне на вока», прыблізна, у галаве. **Дакладных планаў уборкі няма. Гэта — сур'ёзны недахоп, які можа прывесці да самацёку ўборачных работ, да страт.**

Раённыя арганізацыі, сельсоветы, калгасы з гэтага павінны зрабіць вывады: рабочы план у бліжэйшыя дні павінна мець кожная брыгада.

БАЛАБОСАЎ В., КАЛГАС «ПРАМЕНЬ ОКЦЯБРА» (ШКЛОЎСКІ Р.).

Чырвонай ніткай праходзілі на злёце заявы брыгадзіраў аб гатоўнасці ў найкарацейшы тэрмін выканаць план паставак дзяржаве сельска-гаспадарчых прадуктаў. Гэта вельмі добра.

Многія таварышы падзяліліся канкрэтнымі задачамі ў гэтым напрамку.

Тав. Кохан з Парыцкага раёна расказаў, што ў яго калгасе пабудаваны сушылкі для зярна, бо ў мінулым годзе, напрыклад, з-за вільготнасці зярна затрымліваліся паставкі.

Тав. Казак (калгас імя 1-ай конной, Менскага раёна) гаворыць, што яго калгас ужо разлічыўся з дзяржавай па сену, выканаўшы план сеназдачы проста з поля на дзяржаўныя склады.

Тав. Гулевіч (Рагачоў) гаворыць, што ў яго калгасе рыхтуецца тара для перавозкі зярна — мяшкі, скрынкі.

Гэта— паказальнікі канкрэтнай падрыхтоўкі да сельгаспаставак дзяржаве.

Так павінен рыхтавацца кожны

КРАЖАЎ ЯГОР, КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ» (ЧАЧЭРСКІ Р.).

брыгадзір, кожны калгас.

Патрэбны не словы, а канкрэтныя большэвіцкія справы.

Трэба спадзявацца, што дэлегаты злёта, вярнуўшыся ў калгасы, ліквідуюць выяўленыя недахопы, перанясуць у свае калгасы набыты вопыт, перададуць яго суседнім брыгадзірам, калгасам і на аснове соцспаборніцтва дабіюцца рашаючай перамогі на ўборцы і ў хлебапастаўках дзяржаве.

М. Б.

ГУЛЕВІЧ, КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» (РАГАЧОЎСКІ Р.).

ЗА ЖАЛЕЗНУЮ ПАРТЫЙНУЮ І СОВЕЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

ЛЕЙЗЕР

Сакратар парткалегіі Камісіі Партыйнага кантролю па БССР

НАГА ХАРАКТАРУ ПАД ВІДАМ ПАСЕЎНЫХ, АБАВЯЗАЦЬ НКШЗ, ТО ОГПУ І ПРАКУРАТУРУ СТРОГА САЧЫЦЬ ЗА НЕДАПУШЧЭННЕМ ТАКІХ ВЫШАДКАЎ, ПРЫЦЯГВАЮЧЫ ВІНАВАТЫХ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЦІ».

Старшыня Дзяржплана і намеснік старшыні СНК БССР тав. **Галенда** безадказна адносся да выканання гэтай дырэктывы партыі. І калі ўстала пытанне аб перавозе з Кіева 105 клм. кабеля, прызначанага для беларускай канторы ВЭО, тав. Галенда дае ўказанні Цветметзбыту ў Кіеў такога зместу:

«Кабельную прадукцыю для Беларусі можна адгрузіць на адрас: Менск, **Саюзсельэлектра**. Дакументы адпраўкі шліце ў беларускае ВЭО. На месцы **пераадрасуем**».

Але кантора ВЭО не мае правоў на пасеўныя грузы, а таму тав. Галенда пусціўся на своеасаблівы падлог. Такім чынам была дана прамая дырэктыва пад рознага роду прадлогамі, каб гэты груз прыраўняць да пасеўных грузаў.

У сваіх намерах абыйсці закон урада тав. Галенда быў не адзінокім. Былы намеснік старшыні СНК, цяперашні Наркомлегпром БССР тав. **Балцін** працягнуў яму руку дапамогі. Яшчэ да распараджэння т. Галенда ён паслаў тэлеграму ў НКШЗ тав. Андрэеву з патрабаваннем аб адпраўцы кабельнай прадукцыі з Кіева, матывуючы тым, што неатрыманне гэтай прадукцыі зрывае абсталяванне МТМ і рамонт трактароў, у той час як гэта прадукцыя зусім не прызначалася для машына-трактарных майстэрань.

Максімум энергіі, якая была-б карыснай для іншай справы, праявіў у арганізацыі незаконнай перавозкі з Кіева кіраўнік беларускай канторы ВЭО т. **Куркоў**, якога спакусіла перспектыва на хуткае атрыманне «пасеўных» грузаў.

Незаконныя дзеянні з перавозкай вельмі хутка пацягнулі за сабой другія незаконныя дзеянні з расходваннем грузу. Беларуская кантора Сельэлектра (кіраўнік т. **Шэўчанка**), марку якой выкарыстала кантора ВЭО, параіла выкарыстаць зручны выпадак і скарыстаць для сваіх мэт грузы, да якіх яна не мела ніякіх адносін. Кіраўнік беларускай канторы Саюзсельэлектра Шэўчанка незаконна выдаткаваў па сваёй сістэме 80 клм. кабеля.

Аб незаконным атрыманні і расходванні кабеля беларускай канторай Саюзсельэлектра быў добра асвядомлен намеснік наркамзема БССР тав. **Валковіч**, які спакойна закрыў вочы на гэтыя дзеянні Шэўчанка.

XVII з'езд партыі стварыў камісіі партыйнага і совецкага кантролю і абавязаў іх арганізаваць штодзённую праверку, як арганізацыі і паасобныя работнікі праводзяць у жыццё ўказанні партыі і ўрада.

Парткалегія Камісіі Партыйнага Кантролю па Беларусі, разглядзеўшы справу аб незаконнай перавозцы з Кіева і незаконным расходванні кабельных грузаў, налажыла адпаведныя партыйныя спагнанні на ўказаных таварышоў.

Справа аб незаконнай адпраўцы і расходванні кабеля павінна быць сур'ёзнай перасцярогай тым асобам у нашай партыі, якія скрозь пальцы глядзяць на совецкую і партыйную дысцыпліну.

Гэты ўрок павінны ўлічыць усе арганізацыі і іх кіраўнікі. Партыя не дапусціць, каб яе пастановы не выконваліся. І ўсякі, хто будзе іх парушаць, будзе прыцягвацца да найсуровейшай партыйнай адказнасці.

Задача заключаецца ў тым, каб штодзенна, умацоўваць, партыйную і совецкую дысцыпліну. Партыя не зважаючы на асобы з большэвіцкай непрымірымасцю будзе даваць адпор кожнаму, хто папрабуе парушыць партыйныя і совецкія законы.

Партыйныя арганізацыі павінны сваю штодзенную работу паставіць так, каб яшчэ больш умацоўваць адказнасць і жалезную большэвіцкую дысцыпліну кожнага члена партыі.

ПРА ПАРУШЭННЕ ПАСТАНОВЫ СНК СССР АД 5 ЛЮТАГА 1934 ГОДА АБ ПАРАДКУ ПЕРАВОЗАК ПАСЕЎНЫХ ГРУЗАЎ І АБ НЕЗАКОННЫМ ВЫДАТКАВАННІ ВОСТРА-ДЭФІЦЫТНАЙ КАБЕЛЬНАЙ ПРАДУКЦЫІ

Пастанова парткалегіі Камісіі Партыйнага кантролю па БССР

Тав. Галендо (старшыня Дзяржплана і нам. старшыні СНК БССР)

Груба парушыў пастанову СНК СССР ад 5 лютага 1934 года аб парадку перавозак пасеўных грузаў, указаўшы грузаадправіцелю — кіеўскай канторы Цветметзбыт грузаатрымацеля — Саюзсельэлектра замест ВЭО з мэтай вывезці прадукцыю як пасеўны груз, дапусціў сваімі незаконнымі дзеяннямі выдаткаванне востра-дэфіцытных кабельных матэрыялаў не па прызначэнню.

Тав. Галендо, як старшыня Дзяржплана і нам. старшыні СНК, ведае, што прызначаная да адгрузкі ў Беларусь кабельная прадукцыя не з'яўляецца пасеўным грузам і што яна па нарадах цэнтра належыць Белканторы ВЭО, 22 сакавіка даў распараджэнне кіеўскай канторы Цветметзбыт аб адгрузцы гэтай кабельнай прадукцыі ў адрас Менск, Сельэлектра, указаўшы ў сваім распараджэнні: «Кабельную прадукцыю грузіць Менск, Саюзсельэлектра, дакументы адпраўкі шліце Белканторы ВЭО, пераадрасуем на месцы», з мэтай вывезці прадукцыю, як пасеўны груз, што і было зроблена.

Гэта прывяло да таго, што Белканторы Саюзсельэлектра, скарыстаўшы гэтае незаконнае дзеянне, большую частку з атрыманай кабельнай прадукцыі незаконна выдаткавала па сваёй сістэме, парушыўшы нармальную работу прамысловасці і іншых дзяржаўных арганізацый.

ПАСТАНАВІЛІ:

Тав. Галендо за грубае і свядомае парушэнне пастановы СНК СССР ад 5 лютага 1934 года аб парадку перавозак пасеўных грузаў і дапушчэнне гэтымі незаконнымі дзеяннямі выдаткаванне востра-дэфіцытных кабельных матэрыялаў не па прызначэнню — АБВЯСЦІЦЬ СУРОВУЮ ВЫМОВУ і папярэдзіць, што ў выпадку паўтарэння ў сваёй рабоце падобных праступкаў ён будзе падвергнут больш суроваму партыйнаму спагнанню.

Тав. Балцін (былы нам. старшыні СНК, зараз наркамлегпром БССР)

Даў тэлеграму НКШ т. Андрэеву з патрабаваннем аб адпраўцы з Кіева кабельнай прадукцыі з матывіроўкай, што неатрыманне гэтай прадукцыі зрывае абсталяванне МТМ і рамонт трактароў, у той час, як гэта прадукцыя прызначалася не для МТМ і рамонту трактароў, а для ВЭО.

ПАСТАНАВІЛІ:

Указаць тав. Балціну на несур'ёзны падыход да дакументаў, выходзячых за яго подпісам.

Тав. Куркоў (кіраўнік Белканторы ВЭО)

удзельнічаў у арганізацыі незаконнай перавозкі кабельнай прадукцыі, належачай ВЭО, у адрас Саюзсельэлектра, як пасеўнага груза, з прычыны чаго прыбыўшая кабельная прадукцыя была захвачана і незаконна выдаткавана.

ПАСТАНАВІЛІ:

Тав. Куркову за ўдзел у парушэнні пастановы СНК СССР ад 5 лютага 1934 года аб парадку перавозкі пасеўных грузаў і непрыняцце неабходных мер да звароту прадукцыі ад Сельэлектра, чым ён дапусціў выдаткаванне прадукцыі не па прызначэнню, — АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ.

Тав. Ваўковіч (нам. наркамзема БССР)

Ведаючы аб незаконным атрыманні і выдаткаванні Белканторай Саюзсельэлектра кабельнай прадукцыі, належачай Белканторы ВЭО, не прыняў неабходных мер да недапушчэння незаконнага выдаткавання кабеля і звароту апошняга ВЭО,

ПАСТАНАВІЛІ:

Тав. Ваўковічу, за непрыняцце мер да звароту кабельнай прадукцыі ВЭО, як няправільна атрыманай у адрас Сельэлектра і за дапушчэнне незаконнага выдаткавання кабеля — АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ.

Тав. Шэўчэнка (кіраўнік Белканторы Саюзсельэлектра)

Не маючы нарадаў на атрыманне кабеля ў першым квартале 1934 года і ведаючы, што прыбываючыя 105 кіламетраў кабеля ў адрас Сельэлектра з Кіева належаць Белканторы ВЭО, у адрас якой высланы дакументы адпраўкі і рахункі для аплаты, па атрыманні прадукцыі прыступіў да яе незаконнага выдаткавання і, не гледзячы на распараджэнне нам. старшыні СНК тав. Галендо аб неадкладным звароце кабельнай прадукцыі ВЭО, распараджэння гэтага не выканаў, незаконна выдаткаваў 80 кіламетраў кабеля па сістэме Сельэлектра, —

ПАСТАНАВІЛІ:

тав. Шэўчэнка за незаконнае выдаткаванне кабельнай прадукцыі, належачай ВЭО, і за невыкананне распараджэння нам. старшыні СНК БССР аб неадкладным звароце кабельнай прадукцыі ВЭО АБВЯСЦІЦЬ СУРОВУЮ ВЫМОВУ. Лічыць немагчымым астаўленне яго ў далейшым на гэтай рабоце.

САКРАТАР ПАРТКАЛЕГІІ КАМІСІІ ПАРТЫЙНАГА КАНТРОЛЯ ПА БССР ЛЕЙЗЕР.

АБ ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАННЯ РАШЭННЯ МАЙСКАГА ПЛЕНУМА ЦК КП(б)Б ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ ДА ХЛЕБАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ ПА СІСТЭМЕ ЗАГОТЗЯРНО

ПАСТАНОВА БЮРО І К КП(б)Б

1. ЦК канстатуе, што ход падрыхтоўкі тэхнічнай базы да хлебазагатоўчай кампаніі па сістэме Заготзярно не забяспечвае падрыхтоўку тэхнічнай базы да тых канчатковых тэрмінаў, якія ўстаноўлены майскім пленумам ЦК.

Капітальны рамонт зернаскладаў, на 15 ліпеня 1934 г. выканан на 73 проц., рамонт сушылак на 60 проц., бягучы рамонт транспарцёраў на 68 проц., бягучы рамонт зернаскладаў на 65 проц., дэзінфекцыя зернаскладаў на 60 проц., тары на 40 проц., проціпажарныя мерапрыемствы — 49 проц.

Па капітальнаму рамонту пункты: Дрыса, Бабкі, Слуцак выканалі план па рамонту ўсяго на 10 проц.

Па бягучаму рамонту пункты Беларусь, Негарэлае, Жодзіна, Крупкі, Бярэзіна, Лёзна нічога яшчэ не зрабілі.

Па дэзінфекцыі зернаскладаў пункты Бярэзіна, Горкі, Обаль, Расоны, Мілае, Пухавічы, Буда-Кашалёў, Асіпавічы і т. д. таксама нічога не зрабілі.

Па проціпажарных мерапрыемствах пункты Слаўнае, Хадасы, Віцебск, Бешанковічы, Сураж, Чавусы, Б.-Кашалёў, Лоеў, Парычы, Несята, Урэчча, Калінкавічы, Пасталы і іншыя ніякіх мерапрыемстваў не праводзяць па рамонту проціпажарнага інвентара, а таксама па будаўніцтву калодзежаў, вадаёмаў.

Папярэдзіць старшынь рай- і горвыканкомаў вышэйпералічаных раёнаў, райупаўнаважаных Камітэта заготавак СНК, загадчыкаў пунктамі Заготзярно, а таксама ўпаўнаважаных Белканторы Заготзярно, прымацаваных да пунктаў па падрыхтоўцы тэхнічнай базы, што калі па зводцы на 30 чэрвеня 1934 года не будуць закончаны вышэйпералічаныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы тэхбазы, да іх будуць прыняты суровыя меры партыйных і совецкіх спагнанняў.

3. Папярэдзіць райкомы партыі, што зараз трэба займацца па падрыхтоўцы тэхбазы не сігналізацыяй у ЦК і ў Заготзярно аб адсутнасці дастатковых сродкаў па падрыхтоўцы тэхбазы, а поўнасцю скарыстаць тыя сродкі, якія адпушчаны па лініі Заготзярно на падрыхтоўку тэхбазы і правесці тыя мерапрыемствы, якія не патрабуюць сродкаў.

4. За бяздзейнасць па падрыхтоўцы тэхбазы па ўсіх відах работ загадчыка Бярэзінскім пунктам Заготзярно т. ХОДАША з работы зняць, аб'явіўшы яму вымову.

5. ЦК адзначае, што, не гледзячы на рашэнне ЦК і тэлеграмы сакратароў ЦК, да гэтага часу райкомы партыі Чашніцкі, Расонскі, Дубровенскі, Сенненскі, Барысаўскі, Бярэзінскі, Заслаўскі, Асіпавіцкі, Чавускі, Крычаўскі, Рэчыцкі, Хойніцкі, Лепельскі, Кармянскі, Прапойскі, Мазырскі, Касцюковіцкі не выпучылі кандыдатуры на заг. пунктам Заготзярно і не прыслалі ў камісію ЦК на зацвярджэнне.

6. Папярэдзіць сакратароў вышэйпералічаных РК партыі, што, калі яны ў бліжэйшыя дні не выпучаць работнікаў з раённага кіруючага актыва на загадч. пунктам Заготзярно і не прышлюць у камісію ЦК на зацвярджэнне, яны тым самым зрываюць падрыхтоўку тэхбазы да хлебазагатоўчай кампаніі па ўмацаванню кадрамі пунктаў Заготзярно, ЦК вымушан будзе да сакратароў РК партыі, не выканаўшых рашэнні ў тэрміну, прыняць суровыя меры партыйных спагнанняў.

СТАРАДАРОЖСКАЯ ЧУБАРАУШЧЫНА

АД УЛАСНАГА КАР. „ЗВЯЗДЫ“

ЗМЯШЧАЮЧЫ АРТЫКУЛ ТАВ. ІЗОХА АБ ЧУБАРАЎШЧЫНЕ Ў СТАРЫХ ДАРОГАХ, РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ» ЛІЧЫЦЬ, ШТО ГЭТЫ ФАКТ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫКЛЮЧНА АБУРАЮЧЫМ. ГЭТА ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА ТЫМ, ШТО РАЁННЫЯ, ПАРТЫЙНЫЯ І СОВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ, У ТЫМ ЛІКУ ПРАКУРАТУРА І РАЙМІЛІЦЫЯ НЕ ЗРАЗУМЕЛІ ПАЛІТЫЧНАГА ЗНАЧЭННЯ ГЭТАЙ СПРАВЫ, НЕ УЗНЯЛІ ЯЕ НА ПРЫНЦЫПОВУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ВЫШЫНЮ.

СУД, ЯКІ РАЗГЛЯДАЎ ГЭТУ СПРАВУ, ЗВЕЎ ЯЕ ДА ПРОСТАГА ХУЛІГАНСТВА, НЕ ЗАЎВАЖЫЎШЫ, ШТО ТУТ ДЗЕЙНІЧАЕ РУКА КЛАСАВАГА ВОРАГА, КУЛАКА, АНТЫСЕМІТА. А КАСАЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ ВЯРХОЎНАГА СУДА (СТАРШЫНЯ ТАВ. ПРЭСМАКОЎ) НЕ ТОЛЬКІ НЕ ВЫПРАВІЛА ГРУБУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ПАМЫЛКУ НАРОДНАГА СУДА, АЛЕ І ЗМЯКЧЫЛА ЯГО ПРЫГАВОР, ПРАЯВІЎШЫ ГНІЛА-ЛІБЕРАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ ДА СТАРАДАРОЖСКІХ ЧУБАРАЎЦАЎ.

РЭДАКЦЫЯ ЗВАРАЧАЕ ЎВАГУ ПРАКУРАТУРЫ РЭСПУБЛІКІ НА НЕАБХОДНАСЦЬ ТЭРМІНОВАГА ЎМЯШАННЯ Ў РАЗГЛЯД ГЭТАЙ СПРАВЫ І ПАТРАБУЕ ПЕРАГЛЯДУ РАШЭННЯ СУДА. «ЗВЯЗДА» ЛІЧЫЦЬ, ШТО ГЭТА СПРАВА МАЕ ВЫКЛЮЧНА ВАЖНАЕ ПАЛІТЫЧНАЕ І ГРАМАДСКАЕ ЗНАЧЭННЕ, ТАМУ СЛУХАННЕ ГЭТАЙ СПРАВЫ ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ У ПАКАЗАЛЬНЫМ ПАРАДКУ ПА МЕСЦУ ЗЛАЧЫНСТВА.

Мы ўжо амаль забылі жудасную справу, якая адбылася ў Чубараўскім завулку. Учынкам зверападобных хуліганаў была тады абурана ўся грамадскасць Совецкага Саюза.

Цяпер, у 1934 годзе, «чубараўшчына» паўтарылася ў Стара-Дарожскім раёне. Але тут, пад сваёй знешне-крымінальнай афарбоўкай яна мае нацыянальна-палітычную аснову.

Вёска Новыя Фалічы ад свайго Новадарожскага сельсовета знаходзіцца ў 5 кілометрах і ад раённага цэнтра — у 15 кілометрах. Раскінулася яна на краі поля, задворкамі сваімі прыціснуўшыся да лесу. Тры гады назад тут арганізаваўся калгас «Новай працы». Дык вось з адным пратаколам праўлення гэтага калгаса мы хочам пазнаёміць шырокую грамадскасць.

Ужо ў пачатку красавіка гэтага года праўленне калгаса было вельмі заклапочана тым, як-бы «найлепш» сустрэць і «правесці» першамайскае свята. За некалькі дзён да свята праўленне склікала агульны сход калгаснікаў. На «парадку дня» ў пратаколе запісана адно пытанне: «Аб святкаванні 1 мая». Пастанавілі: «Закупіць за кошт калгаса гарэлкі на 360 рублёў. На закуску — зарэзаць калгасную цёлку». План святкавання, прапанаваны праўленнем, быў зацверджан «аднагалосна».

Наступілі дні рэалізацыі гэтай пастановы. Бурныя гэта былі дні. У першы дзень мая пагалоўна ўсе п'янствавалі. Не прымалі ўдзелу толькі «чужыя» — не сваякі (такіх у калгасе толькі няцэ сем'яў). Напіўшыся «до сыта, до отвала», ішлі граміць аднаасобнікаў. Ламалі платы, лавілі іх курэй. З дзікім гіканнем і лаянкай вырывалі салому са стрэх, смалілі курэй і жорлі, запіваючы гарэлкай. Усё гэта рабілася знарок па дварах і ў прысутнасці напалоханых аднаасобнікаў.

Позна ноччу заціхлі гукі п'янай раз'юшанай банды. Заціхлі з тым, каб назаўтра, 2 мая, паўтарыцца з яшчэ большай сілай. Дапівалі гарэлку і даядалі цёлку ў канцылярыі калгаса. Надумалася вірнуць у гэту канцылярыю грамадзянцы С., якая ў гэты час была з дзіцем на руках. Ля самых дзвярэй яе «ветліва» сустрэў старшыня калгаса Лапанік Антон. А брыгадзір Лапанік Хведар тут-жа паднёс ёй шклянку гарэлкі. Яна выпіла. Даверлівая ахвяра аказалася ў лапах звяроў — да гэтага яны доўга імкнуліся.

Хутка жанчыне стала нядобра. Пакінуўшы дзіця ў хаце, яна вышла ва двор і прылегла на траву. Услед за ёй выйшлі Глазкоў і Яновіч. Шчэрба «падняў» жанчыну, а Яновіч адчыніў хлеў і «штурхнуў» іх туды абодвух. І там... Потым уварваўся туды і Яновіч. А тымчасам старшыня калгаса, бацька яго і брыгадзір арганізавалі ўсіх сваіх п'яных сваякоў і накіроўвалі іх на чарзе ў хлеў.

— Падыходзь за пропускам у хлеў, — камандавалі яны пад дзікі рогат п'янай вграі.

Некаторых, што сталі ў баку, «пасіўных», хапалі, сілком уштурхоўвалі ў хлеў і зачынялі за імі дзверы. Так быў укінут у хлеў Рагавенка Зміцер. Убачыўшы жудасны малюнак за зачыненымі дзвярмі, небарака ўцёк з хлява праз страху.

Калі «чарга выдахлася», старшыня «загадаў» вынесці непрытомную жанчыну на траву, пад грушу...

Ён аказаўся правым: С. прышлося вынесці... У судовай справе ёсць адпаведныя паказанні сведак і медыцыны аб тым, што С. была фізічна скалечана, акрываўлена, з парванай вопраткай... у непрытомнасці». Усе доказы таго, што сіла сілу перамагла. Аб гэтым паказвае і сама ахвяра.

— Я доўга змагалася, але Шчэрба... Яновіч... Яны павыкручвалі мне рукі... Я потым страціла прытомнасць і не памятаю, што са мной рабілася і што рабілі яшчэ са мной.

***

У п'янцы 1 мая прымала ўдзел шмат жанчын. Нямала іх было і назаўтра ў самой, так званай, канцылярыі, дзе дапівалі гарэлку ў час прыходу туды С. (ні яна, ні муж у п'янцы ўвесь час не прымалі ўдзелу). Чаму-ж імённа С., жонка Р., была выбрана ахвярай?

Калгас налічвае 45 гаспадарак. З іх 40 — пераплецены паміж сабой сваяцтвам і толькі 5 не належалі да іх лагера, «чужымі» былі. Гэтыя пяць з'яўляліся перашкодай для Лапанікаў у іх сямейных махінацыях. «Чужыя» былі літаральна тэрарызаваны, лічыліся бясправнымі. У «чужых» кралі працадні, уліку у калгасе не было ні ў мінулым, ні ў гэтым годзе.

Да ліку «чужых» належаў і Р. Сам ён па нацыянальнасці яўрэй, а жонка яго С. — беларуска. Прышоў ён у гэту вёску тры гады назад, у 1932 годзе ўступіў у калгас. Тут і ажаніўся. Такім чынам, Р. для Лапанікаў быў чужы яшчэ і па нацыянальнасці.

Пачалі Р. і С. «умешвацца не ў свае справы», пачалі выкрываць спачатку асобныя дробныя недахопы, выкрываць адкрыта, на сходах. Лапанікі да крытыкі не прывыклі. Хто адважыўся іх крытыкаваць, а тым больш «нейкі там прышлы...»? Лапанік Антон робіць пачын. У прысутнасці іншых ён абзывае Р. «жыдоўскай харай», скора гэта ўвайшло ў сістэму. Усе сваякі, ад малога і да старога, іншым імем Р. не называлі, як «жыд», «жыдоўская хара», «жыдоўская морда» і т. д. Асабліва дапякалі яго жонцы за тое, што яна адважылася выйсці замуж за «нехрышчонага». Пры ўсякім зручным выпадку абзывалі яе «паўжыдкам», і ўсякімі іншымі брудными словамі.

У часе асенняй пасеўнай 1933 г. брыгадзір Лапанік Хведар краў насенне ячменю і сплаўляў у млын прама з поля. Жонка Р. выкрыла гэта злачынства і Лапанік атрымаў год прымусовых работ. Пасля гэтага пачалося ўзмоцненае цкаванне. Словам, рашылі выжыць сям'ю Р. з калгаса, чаго-б гэта ні каштавала. А калі гэта не ўдасца, дык хоць разбурыць сям'ю, каб Р. кінуў сваю жонку С. і паехаў. А з ёю адной ужо лёгка будзе разлічыцца. Вось чаму Лапанік Хведар у часе гвалту над С., як ашалелы бегаў па Новых Фалічах, шукаючы Р. Шукаў, каб прывесці яго і сказаць: «Вось паглядзі, на што здольна твая жонка. Яна сама... Хіба будзеш з ёю жыць разам...»

***

Цяпер глянем, як гэта крымінальная і палітычная справа праходзіла ў старадарожскіх судова-следчых органах. Ды не толькі ў старадарожскіх, але і ў вышэйшых, у Менску.

У папойцы 1 мая прымае актыўны ўдзел міліцыянер аператыўнай часткі старадарожскай міліцыі Глазкоў. У яго прысутнасці п'яная хэўра граміла аднаасобнікаў. Варочаючыся ноччу дамоў, Глазкоў у Новых Дарогах збіває настаўніка. 2-га мая адбываецца «чубараўшчына». 4 мая ў раённую міліцыю паступае заява Р. Даручаецца расследаваць справу памочніку начальніка раймілыцыі па аперчасці Крукаву, які перадаручае не свайму памочніку... Глазкову.

Глазкову спяшацца няма чаго... Толькі чатырнаццатага мая ён прыступае да «работы». На працягу трох дзён дапытвае пацярпеўшую, сведак і потым... непасрэдных удзельнікаў «чубараўшчыны». Допыт удзельнікаў адбываецца ў той самай абстаноўцы, што і 2-га мая ў «канцылярыі»: чарка гарэлкі, закуска...

Дарэмна вы будзеце шукаць у два наццаці пратаколах, складзеных Глазковым, хоць-бы адно слова аб прычынах гэтага контррэволюцыйнага здарэння.

Старонкі пратаколаў яўна прасякнуты «гарэлкай» «с пристрастием». Глазкоў упарта дапытваўся колькі тады ў «канцылярыі» выпілі паўлітраў, колькі шклянак выпіла С. і т. д. Не дзіва, што ў Глазкова «выпалі» пытанні агіднейшага антысемітызма, злачынай кулацкай дзейнасці хэўры Лапанікаў у калгасе. Больш таго, з паказанняў сведак ужо другога следчага відаць, што Глазкоў тэрарызаваў сведак, прымушаў гаварыць тое, што патрэбна было яго хэўры. Не дапамагала — сам пісаў, дадаваў тое, што знаходзіў патрэбным для абароны сваіх сабутыльнікаў.

Мы на гэтым кончым з Глазковым. Дадамо толькі, што ён яшчэ не толькі на свабодзе, але і працягвае працаваць на сваім месцы.

Схамянуліся ўрэшце ў раёне, што вядзенне справы трэба ад Глазкова адабраць. І следства 16 мая перайшло ў рукі памочніка начальніка палітаддзела МТС таварыша Бекешкі.

Тут мы ўпершыню пачулі ад следак словы антысемітызм, сістэматычнае цкаванне Р., як яўрэя, і т. д. Але і тут, у пратаколах тав. Бекешка, вы не ўбачыце чоткай палітычнай кваліфікацыі дзеянняў абнаглеўшага класавага ворага.

Нічым непрыкрыты сістэматычны паход агентуры контр-рэволюцыйнага беларускага шавінізма супроць яўрэя зведзен да асобных «рэплік» і «дакораў» антысеміцкага характару з боку асобных калгаснікаў.

Аб сістэматычным паходзе супроць яўрэя запісана ў абвінавачым заключэнні. На 2-й старонцы чорным па беламу напісана, што ўсё гэта рабілася «...каб скампраметаваць (!) сям'ю Р., або ўнесці сярод калгаснікаў нацыянальную варожасць». Яшчэ за некалькі дзён да свята, па ініцыятыве праўлення калгаса быў склікан агульны сход, на якім вырашылі зарэзаць адно пялёнё і закупіць на 360 руб. гарэлкі. Грошы яны рашылі ўзяць з касы калгаса. Намечаныя мерапрыемствы выкананы поўнасцю».

Вось бачыце, таварышы суддзі, самі вы запісалі, што вораг загадзя рыхтаваўся, каб зрабіць злачынства. Загадзя закупіў гарэлку і «выканаў свае мерапрыемствы поўнасцю».

Вораг выканаў свае мерапрыемствы. Ён паставіў мэтай не толькі «скампраметаваць» Р., але і ўвесь калгас у яго ўзаемаадносінах з працоўнымі аднаасобнікамі — заўтрашнімі калгаснікамі. Якраз такія факты, ускрываючыя іменна палітычную сутнасць справы, суд не заўважыў. Ён упарта стараўся звесці справу да «кампраметацыі» Р. Лапанікамі. Таму ён і шукаў, хто фізічна ўдзельнічаў у гвалтаванні С.—і толькі.

Справа перайшла ў касацыйную калегію Вярхоўнага суда. Старшыня Прымакоў. Дакладваў член Верхсуда Федасенка. Можа яны выправілі палітычныя памылкі нарсуда? Не! Яны таксама шукалі ў гэтай справе літары закона. І знайшлі. Федасенка «даказаў», што ідэйны арганізатар злачынцаў Лапанік Хведар не быў у хляве і таму артыкул 235 яму дарэмна прыпісалі, што ў справе не ўспамінаецца, каб ён сказаў на Р. «жыд» таму і па арт. 84 ён не вінават. Вывад — усякае абвінавачанне зняць.

Другога натхняльніка і арганізатара гэтай справы Лапаніка Антона (старшыня калгаса) калегія таксама пашкадавала. Прывядзем дасло́ўна вытрымку заключэння калегіі:

«Выключыць арт. 235 з прыгавора адносна Лапаніка А. і дзеянні (!) яго кваліфікаваць па 24-28 арт. арт. КК». Гэта значыць, — толькі ў садзейнасці антысемітызму (адзін год прымусовых работ).

***

Устаюць пытанні, чаму так доўга арудавалі ў калгасе антысеміты і крымінальныя злачынцы і ніхто іх своечасова не выкрыў? Дзе былі раённыя і палітаддзельскія газеты, палітаддзел МТС, у зоне якога калгас знаходзіцца другі год, дзе былі раённыя арганізацыі? І чаму гэту справу «змазалі» на судзе, а пасля зусім «замялі», каб ніхто не ведаў.

Адзін важны факт, які ўсплыў ужо пасля суда, паказвае, чаму райгазета не сігналізавала своечасова. У раённай газеце 31 мая было надрукавана калектыўнае «пісьмо» вучняў. У ім пісалася, што настаўніца Нова-Фаліцкай школы Смольская збівае вучняў, а бацька ёй дапамагае. У той-жа дзень расследваннем парытэтнай камісіі было ўстаноўлена, што «пісьмо» хлуслівае і з'яўляецца актам помсты Лапанікаў супроць настаўніка Смольскага, які актыўна дапамагаў іх выкрыць на судзе. У часе расследвання жонка асуджанага Лапаніка Хведара закрычала, звяртаючыся да работніка райана тав. Машленік:

— Нічога, не ўдалося цяпер, — напішам яшчэ, у нас у рэдакцыі свае людзі.

Пачалі дашуквацца хто-ж гэта «свае людзі»? Аказалася, што ў рэдакцыі райгазеты працаваў на працягу двух год Сулімчык — блізкі сваяк Лапанікаў. А ў саміх Новых Фалічах сядзеў прыяцель Сулімчыка — Лапанік Сямён, які доўгі час ліччыўся актыўным селькорам райгазеты. Ні пра якія злачынствы сваякоў у калгасе «Герой працы» гэты «актывіст» не пісаў. Затое ён пісаў пра другіх і асабліва тых, якія яму не давалі выпіць. Вось чаму раённая газета нават не ведала аб самым факце злачынства.

Пра ўсё гэта яна даведалася ў сувязі з «пісьмом вучняў».

Палітаддзельская газета таксама не магла выкрыць гэтага злачынства таму, што яна «рабілася» рукамі таго-ж Сулімчыка (там няма рэдактара). У апошнія дні выкрылася яшчэ адна дэталь: у палітаддзеле на пасадзе кіномеханіка працуе сваяк асуджаных Лапанікаў. Гэта ён перадаў супрацоўніку райгазеты «пісьмо вучняў».

Не ўзяўся палітаддзел за аздараўленне калгаса «Герой працы» і пасля суда. Гэтым тлумачыцца такі факт. Суд адбыўся 18 мая. А з чэрвеня, у часе калгаснай палітмасоўкі, «агульны» сход (удзельнічалі толькі свае людзі) калгаснікаў размеркаваў «ганаровыя граматы» лепшым ударнікам. І хто іх атрымаў? Лапанік Хведар — асуджаны два разы, і Лапанік Нікалай, які з дня на дзень чакаў арышту за забойства (цікавая дэталь: 5 з паловай месяцаў гуляў забойца на свабодзе, хаваючыся за нейчай спіной в раймілыцыі). І кіраваў гэтым «сходам Лапанікаў» старшы аграном МТС. Затым Лапанікі яшчэ горш абнаглелі — яны адкрыта награжаюць некаторым, якія выкрывалі на судзе іх злачынствы.

***

Здавалася-б, што гэта справа павінна паслужыць сур'ёзным сігналам для раённых арганізацый для ўзняцця інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы. Але нічога ў гэтым напрамку не робіцца.

Уся справа павінна быць перагледжана. Пракуратура рэспублікі павінна назначыць новае следства, каб выкрыць сапраўдных злачынцаў і падняць палітычную сутнасць гэтай справы на належны ўзровень.

П. ІЗОХ.

ПІСЬМА РАБОТНІКАЎ І КАЛЕКТЫВІКАЎ

САКРАТАРУ БРАГІНСКАГА РК КП(б)Б ТАВ. КОЖАРУ
РАЙПРАКУРОРУ ТАВ. ГЕРТ

ЗАЖЫМШЧЫКАЎ САМАКРЫТЫКІ— ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЦІ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА).

Я напісаў заметку ў брагінскую раённую газету «Трыбуна калгасніка» аб прысваенні соўгасных і прафсаюзных грошай старшынёй рабчкома соўгаса Астрагляд, Мацюшэнкам. Газета паслала маю заметку на расследванне дырэктару гэтага-ж соўгаса Кардашу. Ён замест расследвання расказаў аб заметцы Мацюшэнку і на гэтым супакоіўся. Я пачаў настойваць перад старшынёй рэўкамісіі аб расследванні гэтай справы. Тады дырэктар па згодзе з Мацюшэнкам знімае мяне з работы, матывуючы гэта скарачэннем штатаў. Трэст аднавіў мяне на работе, бо штат нашага соўгаса не падлягае скарачэнню. Але дырэктар адмовіўся падпарадкавацца рашэнню трэста. Потым я звяртаўся ў РК КП(б)Б і ў райпрофсавет. Усе абяцаюць дапамагчы мне. Але гэтыя абяцанні застаюцца толькі абяцаннямі. Я-ж ужо больш месяца без работы.

Мяцельскі.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя асобна звяртае ўвагу брагінскага РК і пракурора на абураючы факт праследвання рабкора і чакае, па-першае, неадкладнага аднаўлення т. Мяцельскага на работе, па-другое, строгага пакарання зажымшчыкаў самакрытыкі.

СТАРШЫНІ ЧЭРЫКАЎСКАГА РВК тав. РАТАЙКО

САКРАТАР СЕЛЬСОВЕТА—КУЛАЦКІ АГЕНТ

(ПІСЬМО ВЕТІНСПЕКТАРА)

У Горкаўскім сельсавеце, Чэрыкаўскага раёна, сакратар сельсовета тав. Емельянаў Кастусь выдаў свайму дзядзьку кулаку Кандзікову Аўраму з в. Губіншчака даведку аб тым, што ён бядняк. Кандзікоў быў раскулачан яшчэ ў 1930 г., як эксплаататар чужой працы. Цяпер Кандзікоў з бядняцкімі дакументамі паехаў, каб дзе-небудзь пралезці на вытворчасць.

Емельянаў свядома выкарыстаў сваё службовае становішча для дапамогі кулаку.

А. Т.

СТАРШЫНІ МЕНСКАГА ГОРСОВЕТА тав. ЖУКОВІЧУ

КАЛІ Я АТРЫМАЮ КВАТЭРУ

(ПІСЬМО ЧЫРВОНААРМЕЙЦА

Двое маіх дзяцей 9 і 13 год маюць вылікія музычныя здольнасці. Наркомасветы звярнуў на іх увагу і знайшоў патрэбным даць ім сталую музычную асвету.

З гэтай мэтай я пераехаў з Барбуйска, дзе меў добрую кватэру, у Менск, дзе мае сыны паступілі ў музычны тэхнікум па класу скрыпкі.

Не гледзячы на пастановы ўрада аб стварэнні належных умоў для развіцця юных дараванняў, дзеці мае не маюць такіх умоў. Я жыву з імі ў разбураным доме па Гандлёвай вуліцы № 13/5 на чардаку, які кожны дзень можа абваліцца. Дзеці хварэюць ад сырасці.

У такіх умовах мы жывем паўтара года. Зразумела, дзеці не могуць паспяхова займацца.

Я маю некалькі ходайніцтваў аб прадстаўленні мне кватэры ад камандавання палка, (я служу ў Чырвонай армії з 1918 г.), ад наркома асветы т. Чарнушэвіча, ад дырэктара музтэхнікума.

Але Горсовет і Горжыласаюз ні на што не звяртаюць увагі.

АСНОВІЧ.

САКРАТАРУ СМАЛЯВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. КУДМАНУ

ПАРТГАБІНЕТ ІСНУЕ, АЛЕ НЕ ПРАЦУЕ

(ПІСЬМО РАЁННАГА РАБОТНІКА)

Смалявіцкі партгабінет добра ўкамплектаван работнікамі, мае дастатковa літаратуры і газет, добрае памяшканне. Але, не гледзячы на ўсё гэта, работа пастаўлена зусім дрэнна.

План работы адсутнічае. У якія дні партгабінет працуе, невядома. У гэтым годзе ў партгабінеце не праведзена яшчэ ні адной лекцыі па партасвеце. Не вядзецца работа па папулярызацыі важнейшых пастаноў партыі і ўрада. Радыё ў габінеце заўсёды маўчыць. Партгабінет амаль ніхто не наведвае.

Смалявіцкі РК КП(б)Б за год не меў часу, каб наладзіць работу партгабінета.

Наведвальнік.

ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

Настаўнікі Танежыцкага сельсовета, Тураўскага раёна, т.т. Ніколаенка, Віктаровіч і Ўнук звярнуліся ў рэдакцыю за дапамогай. На працягу двух-трох месяцаў ім не выдаюць заработнай платы па віне дырэктара банка і старшыні сельсовета.

Тураўскі РВК паведамляе, што факты, паказаныя ў пісьме настаўнікаў, — пацвердзіліся. Прэзідыум РВК пастанавіў: дырэктара райбанка т. Баумштэйна як не апраўдаўшага сябе на работе і не забяспечыўшага выплаты зарплаты настаўнікам з работы іншць і справу аб ім перадаць суду.

***

Селькор «Востры» з Ушацкага р-на паведаміў аб тым, што кантралёр ашчалкасы Глыбачанскага сельсовета тав. Іваньковіч груба адносіцца да настаўнікаў, несвоечасова выплачвае зарплату. Выплачаныя аблігацыі Іваньковіч не выдае, кажучы: «падпішуся на другія».

Ушацкі РВК паведамляе, што пры расследванні факты пацвердзіліся. За бюракратычныя адносіны да настаўнікаў кантралёр Іванчук атрымаў суровую вымову з папярэджаннем.

***

Селькор «Зорка», Петрыкоўскага раёна пісаў у рэдакцыю, што ў калгасе «Зорка», Асовіцкага сельсовета, поўная безгаспадарчасць. Зусім дрэнна пастаўлен учот.

Петрыкоўскі райком КП(б)Б паведамляе, што факты пацвердзіліся. За дапушчаныя шкодніцкія адносіны да калгаса праўленне калгаса распушчана. Старшыня калгаса Вінакур выключан з партыі і аддан пад суд.

***

Група комсамольцаў Віцебскага раёна прыслала ў рэдакцыю пісьмо, у якім паведамляе, што ў калгасе «Новае жыццё», Старасельскага сельсовета, пралезлі класава-варожыя элементы кулакі Герман Сямён, Герман Мікола і Пісаў Даніла, якія займаліся раскраданнем калгаснай маемасці.

Віцебскі гарэа паведамляе, што факты пацвердзіліся. Кулакі Герман Сямён, Герман Мікола з калгаса выключаны і аддаены пад суд. Кулак Пісаў таксама з калгаса выключан і абкладзен у індывідуальным парадку. З боку гарэа прыняты меры для паляпшэння работы ў калгасе.

***

Селькоры з Любаньскага раёна паведамілі ў рэдакцыю, што старшыня калгаса «Новы шлях» Вітнеўскі пашкоднічку адносіцца да гаспадаркі. Жывёла знаходзіцца ў дрэнных умовах. На работу калгаснікі выходзяць зусім позна. Адсутнічае працоўная дысцыпліна. Любаньскі РК паведамляе, што старшыня калгаса Вітнеўскі знят з работы і выключан з калгаса.

***

Селькоры «Пайшчыкі» з Горацкага раёна пісалі ў рэдакцыю аб недахопах у рабоце Ліхачоўскага сельпо. Промтавары разбазарваюцца работнікамі сельпо, старшыня Літвінаў заўсёды п'янствуе.

Пракурор Горацкага раёна паведамляе, што старшыня сельпо Літвінаў і крамнік Абакзновіч зняты з работы і справа перадана ў суд.

***

Селькор з Мсціслаўскага раёна пісаў, што старшыня калгаса «Чырвоны партызан» Новікаў сістэматычна п'янствуе. Арганізаваў з сваёй радні групу шкоднікаў, якія даводзяць гаспадарку калгаса да развалу.

Мсціслаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты пацвердзіліся. Пастановай бюро РК КП(б)Б старшыня калгаса «Чырвоны партызан» Новікаў за сістэматычнае п'янства з работы знят. МТС прынят рад мер для аздараўлення работы калгаса.

У ПАЛОНЕ ШАВІНІСТЫЧНЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ

На менскіх цагельных заводах працуе значная колькасць рабочых-немцаў. Многія з іх вельмі дрэнна разумеюць па-беларуску, або па-руску.

Колькі раз узнімалася пытанне аб абслугоўванні нямецкіх рабочых на іх роднай мове, але ні мясцовыя партыйныя, ні профсаюзныя арганізацыі за гэту работу не ўзяліся. Яшчэ ў сакавіку Нацкамісія ЦВК БССР прапанавала ЦП саюза керамікаў наладзіць палітмасавую і інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу сярод рабочых-немцаў цагельных заводаў. Нацкамісія звяртала ўвагу ЦП саюза на неабходнасць надзялення рабочых-немцаў агародамі на аднолькавых падставах з астатнімі рабочымі. Тым не менш значная колькасць рабочых-немцаў засталіся без агародаў.

ЦП саюза керамікаў і яго фабком на заводах № 2-4 Менскага гарадскога совета апынуліся такім чынам у палоне шавіністычных элементаў, распальваючых нацыянальную варожасць паміж рабочымі-беларусамі (пераважна сезоннікаў) і рабочымі-немцамі.

Рабочыя-немцы вызначаюцца на заводзе сваёй большай кваліфікаванасцю ў параўнанні з іншымі рабочымі. За час, у які два рабочых немцы вывозяць з кар'ера 12 вагнетак гліны, другія рабочыя вывозяць толькі тры. Класава-варожыя элементы выкарыстоўваюць нездаваленне адсталых рабочых такой высокай выпрацоўкай немцаў для натрапвання рабочых адной нацыянальнасці на другую.

Партыйныя і профсаюзныя арганізацыі цагельных заводаў замест таго, каб падняць кваліфікацыю адсталых рабочых, абсалютна ў гэтым напрамку бяздзейнічаюць, даюць магчымасць варожым элементам беспакарана весці сваю разбуральную работу.

Нацкоўванне нацыяналістычнымі элементамі адных рабочых на другіх прывяло гэтымі днямі на заводзе № 2-4 да агульнай бойкі. У спрэчку, якая пачалася паміж немцам Іоганс Франкам і рабочымі-беларусамі ўмяшаліся другія рабочыя. Спрэчка перайшла ў бойку, у час якой загадчык гаспадаркі член партыі Чычко паваліў на зямлю і збіў рабочага-немца Клесцера.

Сакратар парткома тав. Мяшкоў (ён-жа і намеснік дырэктара) ацаніў гэту бойку, як звычайнае, як ён кажа, бузацёрства і не палічыў нават патрэбным мабілізаваць на гэтых канкрэтных фактах класавую пільнасць партыйцаў і рабочага калектыва.

Нічога не зрабіў у гэтым напрамку і Менскі горсовет, які мае ўжо даволі сігналаў аб дзейнасці класава-варожых элементаў на цагельных заводах.

Л. К.

ПАТУРАЛЬНІКІ ХУЛІГАНСТВА

У ноч з 11 на 12 чэрвеня па ўсіх будках, блокпастах і станцыях Аршанскага раёна палітаддзельцы правяралі рэалізацыю рашэння партыі і ўрада аб барацьбе з хуліганствам.

Яны, па заданню начальніка палітаддзела тав. Кірылава, на-хаду стварылі аператыўныя брыгады з прадстаўнікоў тэрытарыяльных арганізацый, ударнікаў лініі, начальнікаў станцый і чыгуначных майстраў.

Рэйд з'явіўся поўнай нечаканасцю для ўсіх. Гэта забяспечыла яму найбольшы палітычны эфект. Прадстала ясная карціна безадказных адносін некаторых асоб да выканання сваіх службовых абавязкаў.

На блокпасце 636 сам начальнік Вішнеўскі спаў п'яным. Дзяжурныя блокпастоў: 569 — Беражоўскі, 565 — Паўловіч, 5 — Гітлевіч, 471 — Сяргееў і раз'езда Чарвякова — Канюшка таксама спалі. А на ст. Пухаўцы за кампанію з дыспетчарам Жукоўскім спалі на стале стрэлачнік Буравы і пуцявы абходчык Сільманенка.

На 529 клм. брыгада ў прысутнасці абходчыка Мушкатава чапала балты ў стыках. Мушкатаў прайшоў міма, не сказаўшы ні слова. Калі ў Мушкатава спыталіся, чаму ён не рэагаваў на дзеянні незнаёмых яму асоб, ён адказаў: «Баюся, я ўжо напалохан. Абяцаў мяне пакалаціць аднойчы адзін з прахожых».

Недобрасумленна адносяцца да інструментаў многія работнікі. У калоне № 6 валялася пад адкосам ваганетка. У казарме 41 ляжаў незакрыты інструмент — ламы, данкраты, лапаты і інш.

Гэтыя факты паказваюць, што сапраўднай рэволюцыйнай пільнасці на лініі яшчэ няма. Толькі людзі, якія страцілі сумленне, забылі аб сваіх абавязках перад пролетарскай дзяржавай, здольны пакідаць адказнейшыя пасты і класціся спаць у час дзяжурства. Гэтым самым яны даюць магчымасць хуліганам рабіць сваю шкодную справу.

Лепшым прыкладам свядомых адносін да выканання сваіх абавязкаў з'явіліся брыгадзіры 3-га акалодка Кароткі, Баранаў, дарожны майстар ст. Смальяны Філін, у якіх увесь інструмент у спраўнасці, пранумаравам, змазан, у кладовых запёрты на замок. У абходчыка Судніка было ўсё ў парадку. Ён брыгаду спыніў, патрабаваў зыйсці з палатна чыгункі.

У асноўным-жа рэйд паказаў, што большасць работнікаў лініі не ўсвоілі і не зразумелі палітычнай сутнасці рашэння партыі і ўрада аб барацьбе з хуліганствам.

Задача палітаддзела заключаецца ў тым, каб яшчэ шырэй і глыбей разгарнуць выхаваўчую работу сярод мас чыгуначнікаў вакол рашэнняў партыі і ўрада, мабілізаваўшы іх на ўстанаўленне рэволюцыйнага парадку і жалезнай дысцыпліны на транспарце.

КАТЫШАЎ, ПРАПАКОПВІЧ, ХРОМ.

ЧЫМ ВЫКЛІКАНЫ ПЕРАБОІ Ў ПАДАЧЫ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ

(ГУТАРКА З НАМ. СТАРШЫНІ ГОРСОВЕТА ТАВ. ШУЛЬКІНЫМ)

У апошнія дні ў Менску назіраюцца перабоі ў падачы электраэнергіі. Учора нам. старшыні гарадскога совета тав. Шулькін заявіў:

— 16 чэрвеня на менскай гарадской электрастанцыі была пастаўлена на рамонт асноўная турбіна. Астаноўка на рамонт была выклікана тэхнічнымі меркаваннямі і зроблена ў мэтах планава-папярэджальнага рамонту.

Меркавалася, што скарачэнне падачы электраэнергіі менскай гарадской электрастанцыяй будзе пакрыта за кошт работы ЦЭЦ. Яна павінна была даць 1500-2000 квт. Але прайшоўшая 21 чэрвеня над горадам навальніца пашкодзіла турбагенератар і ЦЭЦ вымушана таксама спыніцца на 10-12-дзённы рамонт. Усё гэта стварыла часовае напружанне ў забеспячэнні электраэнергіяй прамысловых прадпрыемстваў і насельніцтва горада.

Гарком КП(б)Б, горсовет, упаўнаважаны Наркамцяжпрома прынялі рад мерапрыемстваў, якія павінны забяспечыць рамонт турбіны менскай электрастанцыі і выпраўленне пашкоджанняў ЦЭЦ на працягу 8-10 дзён.

На гэты-ж час значна скарачаецца падача электраэнергіі. Гарком КП(б)Б, горсовет распрацавалі план спажэння электраэнергіяй на гэты адрэзак часу. Электраэнергіяй будуць забяспечаны асноўныя прадпрыемствы горада, а таксама культурна-бытавыя ўстановы (вадаправод, хлебазавод, больніцы, тэатры, кіно і т. д.).

Частцы прадпрыемстваў, якія ў гэты час электраэнергіі атрымліваць не будуць, прапанавана адкусіць рабочых у чарговы адпачынак, а таксама зрабіць неабходны плановы папераджальны рамонт абсталявання.

Гарком КП(б)Б у сваім рашэнні, прынятым па пытанню аб электраспажэнні ў сувязі з рамонтам турбін, папярэдзіў персанальна дырэктароў прадпрыемстваў і кіраўнікоў устаноў, што ўстаноўленая для іх норма электраэнергіі з'яўляецца максімальнай і яны павінны прыняць меры да яе эканомнага выкарыстання.

Калі будуць выяўлены факты перавышэння гэтых норм, то трыкутнікі прадпрыемстваў і ўстаноў будуць прыцягвацца да стражэйшай партыйнай і судовай адказнасці.

У сувязі з тым, што ў некаторых раёны горада электраэнергія пачынаючы з сёнешняга дня часова падазацца не будзе і тым самым частка насельніцтва будзе пазбаўлена святла ў вячэрні час, Гарснабу і казенатрыўным арганізацыям даны ўказанні аб дадатковым снабжэнні працоўных газай.

***

Гарснаб тав. Саф'ян паведаміў карэспандэнту «Звязды», што Камітэт аналу пры СНК БССР выдзеліў 30 тон газы для дадатковага снабжэння насельніцтва. Гарснаб размяркуе па прадпрыемствах для раздачы рабочым 35.000 талонаў на дадатковае атрыманне газы—па аднаму літру. Паміма таго, акрамя звычайнай нормы выдаецца літр газы на дзіцячую кніжку.

Шклофарфаразбытам выдзяляюцца для рознічнага продажу два вагоны лямп

ПРАВАКАТАРАМ ВАЙНЫ НЕ ЎДАСЦА ПАХАВАЦЬ СОВЕЦКІЯ ПРАПАНОВЫ

ПАРЫЖ, 22 чэрвеня (БЕЛТА). «ПЦІ ПАРЫЗ'ЕН паведамляе:

«14 чэрвеня ЛІТВІНАЎ зрабіў НЕЙРАТУ прапанову ператварыць балтыцкі пакт узаемадапамогі ва ўсходняе Локарно, у якім прынялі-б удзел Германія, Польшча і Совецкі Саюз, стаўшы адначасова яго гарантамі. Да яго магла-б далучыцца і Чэхаславакія. Хоць прыём, аказаны гэтай прапанове, як быццам больш чым халодны, французскі ўрад, шчыра падтрымліваючы совецкі праект і жадаючы даказаць Германіі, што ён не імкнецца к яе акружэнню, зрабіў з свайго боку настойлівы дэмарш у Берліне і Варшаве з просьбаю прыняла вывучыць гэты новы праект рэгіянальнага пакта.

У злучэнні з локарнскім дагаворам і балканскім пактам новае пагадненне ахапіла-б амаль усю Еўропу і зрабіла-б магчымым забеспячэнне роўнасці праў ва ўмовах роўнай для ўсіх безапаснасці, а таксама зварот Германіі ў Жэневу і поспех канферэнцыі па зніжэнню і абмежаванню ўзбраеньняў.

Да гэтага часу у нас не стварылася ўражання, што Варшава прыняла французскі дэмарш з большым энтузіязмам, чым Берлін прыняў дэмарш, зроблены пасля сустрэчы Мусаліні з Гітлерам у Венецыі і візіта Гебельса ў Польшчу».

Газеты, каментуючы выступленне французскага ўрада, пішуць аб сумесным франка-совецкім дэмаршы. «АЖАНС ЭКОНОМІК ДЭ ФІНАНСЬЕР» указвае, што, не гледзячы на тое, што французскаму дэмаршу быў аказан непрымальны прыём у Берліне і Варшаве, аўтары праекта «Усходняга Локарно» зусім не лічаць яго пахаваным.

***

ЛОНДАН, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Парыжскі карэспандэнт «НЬЮС КРОНІК» паведамляе: «План безапаснасці», выпрацаваны на аснове прапановы, высунутай т. ЛІТВІНАВЫМ у Жэневе, прадстаўлен 19 чэрвеня французскім урадам на разгляд англійскага ўрада. Карэспандэнт дадае, што англійскі пасол у Парыжы меў гутарку па гэтаму пытанню з Барту і прадстаўнікамі міністэрства замежных спраў.

ВЫСТУПЛЕННЕ ГЕБЕЛЬСА СУПРОЦЬ ПАПЕНА

БЕРЛІН, 21 чэрвеня. (БЕЛТА). На сходзе нацыянал-соцыялістаў выступіў ГЕБЕЛЬС. Хоць Гебельс не называў імён, аспрыё яго прамовы было накіравана супроць Папена. Гебельс асабліва абрушыўся на заяўленне Папена, што настрой шырокіх мас увесь час не павышаецца, і ў выключна рэзкай форме заклікаў сваю аўдыторыю «даць адпор спробам прымазаўшыхся к нацыянал-соцыялістскай партыі суб'ектаў падрываць нацыянал-соцыялізм».

Спыніўшыся на знешне палітычным становішчы Германіі, Гебельс заявіў: «За 17 месяцаў нашага знаходжання пры ўладзе мы вышушаны былі канстатаваць той сумны факт, што ўвесь свет праяўляе ў адносінах да нас, па большай частцы, толькі нянавісць».

„ДЗІЎНЫЯ ПАВОДЗІНЫ ПОЛЬШЧЫ"

ПРАГА, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Па поваду Бухарэсцкай канферэнцыі Малой Антанты блізкая к Бенешу «ЛІДОВЕ НОВІНЫ» піша:

«Раптоўны ад'езд польскага пасланніка з Бухарэста, іменна ў той час, калі адбывалася канферэнцыя Малой Антанты, выклікаў здзіўленне і непрыемны асадак. Гэты ад'езд лічаць незразумелай дэманстрацыяй. У цяперашній абстаноўцы адносіны паміж Польшчай і Румыніяй нельга назваць найлепшымі. Малая Антанта і ў далейшым будзе ўважліва сачыць за дзіўнымі паводзінамі Польшчы ў адносінах СССР, Германіі і Венгрыі».

КАТАРЖНЫЯ ПРЫГАВОРЫ РАБОЧЫМУ ДЗЮСЕЛЬДОРФЕ

БЕРЛІН, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Дзюсельдорфскі надзвычайны суд прыгаварыў 7 комуністычных рабочых да катаржных работ ад 2-х да 7 год па абвінавачванню ў тым, што яны нібыта арганізавалі ў 1932 годзе некалькі ўзрываў. Як відаць, меркавалася скарыстаць працэс для новай кампаніі супроць компартыі. Планы праваліліся, бо двух галоўных абвінавачаных, у тым ліку былога кандэпутата рэйхстага ФЛОРА, суд быў вымушан апраўдаць.

ПАУСТАНЦЫ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ

ШАНХАЙ, 23 чэрвеня. (БЕЛТА). Паведамляюць, што атрад кітайскіх паўстанцаў каля Ідуня (на поўдзень ад Гірына) захапіў 72 вагоны з харчовымі прадуктамі і боепрыпасамі, абязброіўшы японскую ахову. Уведзена многа японцаў.

ЗЕМЛЯТРАСЕННЕ У ТУРЦЫІ

АНКАРА, 23 чэрвеня. (БЕЛТА). У ноч на 20 чэрвеня ў радзе пунктаў Турцыі адчуваліся падземныя штуршкі. У раёне Афіўна-Кара-Хісара разбураны 2 вёскі. У Смірне падземныя штуршкі былі слабей.

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА РАБОЧЫХ АСФАЛЬТАВЫХ ЗАВОДАЎ У АНГЛІІ

ЛОНДАН, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). 22 чэрвеня, пасля разрыву перагавораў паміж рабочымі і прадпрыемцамі, пачалася ўсеагульная забастоўка рабочых асфальтавых заводаў. У сувязі з забастоўкай прыпыняцца дарожныя работы ва ўсіх раёнах краіны. Рабочыя патрабуюць павялічэння зарплаты.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

Японскі пасол у ЗША САІТО, наведаў Рузвельта, а затым міністра замежных спраў ХЕЛЛА. З добра паінфармаваных крыніц у Вашынгтоне перадаюць, што абодва гэтыя наведанні не палепшылі японска-амерыканскіх адносін.

У Тулузе, дзе адбыліся крывавыя сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй, прадаўжаецца ўзбуджэнне. Конная жандармерыя разганяла групы рабочых, якія збіраліся на вуліцы.

Згодна паведамлення газет, у войсках Манчжоу-Го, размешчаных на поўнач ад Бейпіна, адбылося паўстанне. Японскія часці падавілі паўстанне.

У вёсцы каля Потсдама (Германія) забіт касір мясцовай нацыянал-соцыялістскай арганізацыі. Забойства выяўляе карціну рэзкага незадавальнення нацыянал-соцыялістскімі мерамі. Паводле слоў газет, арыштаваны забойца—член каталіцкай арганізацыі «Дэйчэ югендкрафт». Арганізацыя забаронена. Арыштавана 11 чалавек, сярод іх настаўнік вёскі.

ЧЭЛЮСКІНЦЫ У МАСКВЕ

НА ЗДЫМКУ — т.т. КУЙБЫШЭЎ, ШМІДТ, КАМАНІН і іншыя ў АЎТАМАБІЛІ.

У ПРЭЗІДЫУМЕ ЦВК САЮЗА ССР

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ ГЕРОЯМ СОВЕЦКАГА САЮЗА І ЧЭЛЮСКІНЦАМ

Учора ў Крэмлі на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК Саюза ССР старшыня ЦВК т. М. І. Калінін уручыў дакументы (кніжкі і граматы) і Ордэны Леніна героям Совецкага Саюза т.т. Ляпідзеўскаму А. В., Леваневскаму С. А., Молокаву В. С., Каманіну Н. П., Слепнёву М. Т., Вадапянаву М. В. і Дароніну І. В. Ордэны і граматы ўручаны таксама бортмеханікам і лётчыкам-наглядальнікам, якія прымалі ўдзел разам з героямі-лётчыкамі ў перакідцы чэлюскінцаў на сушу, чэлюскінцам на чале з таварышамі Шмідтам, Варонiным, Бабровым, Копусавым і арганізатарам і ўдзельнікам выратоўчых работ на чале з тав. Ушаковым—усяго 124 чалавекам.

Пры ўручэнні ордэнаў і грамат прысутнічалі т. т. Л. М. Кагановіч, В. В. Куйбышэў, А. І. Мікаян, Я. А. Жданаў і другія члены ўрада і ЦК ВКП(б).

Ордэн Чырвонай Звязды ўдзельніка арктычнага пахода Б. Г. Магілевіча, загінуўшага ў часе аварыі «Челюскина», прыняў кіраўнік экспедыцыі — праф. О. Ю. Шмідт.

— Мы будзем захоўваць гэты ордэн,—сказаў т. Шмідт,—разам з партрэтам Магілевіча ў сценах Арктычнага музея.

Па прапанове т. Калініна прэзідыум ЦВК і ўсе прысутныя ушанавалі памяць загінуўшага ўставаннем.

Пасля ўручэння ордэнаў і грамат з прамовамі выступілі старшыня ЦВК т. М. І. Калінін, праф. О. Ю. Шмідт і герой Совецкага Саюза лётчык А. В. Ляпідзеўскі.

КІЕЎ—СТАЛІЦА СОВЕЦКАЙ УКРАІНЫ

Заўтра ўрад УССР пераязджае ў Кіеў — новую сталіцу совецкай Украіны. Дакладна і ў тэрмін выкананa рашэнне XII з'езда КП(б)У і Усеукраінскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта.

Пролетарыят, калгаснае сялянства і ўсе працоўныя УССР з велізарным задавальненнем прымуць гэту вестку. Кіеў, адзін з старэйшых гарадоў Совецкага Саюза, з гэтага моманту становіцца цэнтрам социялістычнага будаўніцтва совецкай Украіны. Пераезд урада ў Кіеў—гэта не толькі вялікая веха на гістарычным шляху развіцця совецкай Украіны, але і факт вялікага міжнароднага значэння.

У «харкаўскі» перыяд сваёй гісторыі Совецкая Украіна прайшла бліскучы шлях вялікіх гістарычных перамог.

Ва ўпартых баях супроць цэнтральнай рады, супроць гетманшчыны, супроць нямецкіх, аўстрыйскіх і іншых інтэрвентаў, супроць дзенікіншчыны, супроць «сваёй» і ўсёй міжнароднай контррэволюцыйнай свалачы пролетарыят і працоўныя сяляне Украіны разам з усім пролетарыятам СССР адстаялі пад кіраўніцтвам большэвікоў Совецкую Украіну ад інтэрвентаў.

Пролетарская дыктатура, совецкая ўлада пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна ператварыла забітую і адсталую царскую калонію ў адну з перадавых індустрыяльных рэспублік Совецкага Саюза. Магутны ўздым Данбаса, тысячы новых прамысловых прадпрыемстваў, гіганты першай пяцігодкі: Дніпрадзэс, Харкаўскі трактарны завод—вось яркія паказальнікі найвялікшых перамог пролетарыята Украіны і ўсяго Совецкага Саюза.

Не менш вялікія перамогі і ў адносінах социялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Правільна назваў вынікі социялістычнага будаўніцтва на Украіне тав. Постышэў калакольным звонам найвялікшай радасці і ўцехай для працоўных Украіны і ўсяго Совецкага Саюза.

Гэтыя вынікі з'яўляюцца пахавальным калакольным звонам для памешчыкаў, капіталістаў, банкіраў, кулакоў, якія грабілі і мучылі Украіну.

Калакольны звон гэтых вялікіх вынікаў з'яўляецца сур'ёзным папярэджаннем ўсім тым, хто марыць аб адрыве Украіны ад Совецкага Саюза...

Перанясенне сталіцы з Харкава ў Кіеў адкрывае новую старонку ў гісторыі Украіны. Набліжэнне урада Украіны і Цэнтральнага партыйнага і совецкага апарата да важнейшых сельска-гаспадарчых раёнаў, якія знаходзяцца на правабярэжжы Украіны, мае выключнае значэнне для далейшай індустрыялізацыі і ўмацавання социялістычнай сельскай гаспадаркі, для развіцця нацыянальна-культурнага будаўніцтва і большэвіцкай украінізацыі.

Няма ніякіх сумненняў, што «кіеўскі» перыяд гісторыі Совецкай Украіны будзе азнаменаваны новымі і новымі буйнымі перамогамі на ўсіх франтах социялістычнага будаўніцтва.

Нацыяналістычная контррэволюцыя на Украіне прабавала не раз процістаўляць Кіеў Харкаву. Гэтыя сляпыя банкроты не бачылі, як нараджаўся і рос новы, совецкі Кіеў, які падвяргаўся велізарным разбурэнням у імперыялістычнай і грамадзянскай войнах, стаў значным індустрыяльным цэнтрам, цэнтрам сярэдняга машынабудаўніцтва і лёгкай індустрыі. Вырасла і мацнела яго пролетарскае насельніцтва. У Кіеве створана вялікая сетка навучальных і навукова-даследчых устаноў і інстытутаў. Кіеў павінен стаць і будзе дастойнай сталіцай пролетарскай Украіны.

Хіба не смешнымі здаюцца жалкія спробы недабіткаў нацыяналістычнай контррэволюцыі, якая прадавала і прадае сябе ўсім контррэведкам буржуазных дзяржаў, будаваць новыя імперыялісцкія планы супроць СССР, разглядаць Кіеў і правабярэжжа Украіны, як плацдарм узброенай барацьбы супроць СССР?

Перанясенне сталіцы ў Кіеў гаворыць аб велізарнай магутнасці ўсяго Совецкага Саюза, аб асуджанасці гэтых спроб, аб сакрушальным адпоры, які атрымліваюць «паны», яшчэ не зразумеўшыя, што Украіна—неад'емная частка вялікага Совецкага Саюза.

ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ПРОЛЕТАРЫЯМ, КАЛГАСНІКАМ, РАБОТНІКАМ НАВУКІ І ТЭХНІКІ, УСІМ ПРАЦОЎНЫМ СОВЕЦКАЙ УКРАІНЫ. АСОБНАЕ ПРЫВІТАННЕ РАБОЧЫМ І ПРАЦОЎНЫМ КІЕВА — НОВАЙ СТАЛІЦЫ УКРАІНСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІЦЫ.

(З перадавога «Правды», прынятага па радыё).

ГЕРОІ СОВЕЦКАГА САЮЗА І ЧЭЛЮСКІНЦЫ У КРЭМЛІ

22-VI ў КРЭМЛІ Ў ГЕОРГІЕЎСКІМ ЗАЛЕ БЫЛО ДАДЗЕНА СНЕДАННЕ ЛЕТЧЫКАМ-ГЕРОЯМ СОВЕЦКАГА САЮЗА, ЧЭЛЮСКІНЦАМ І ІХ СЕМ'ЯМ.

ПРЫСУТНІЧАЛІ, АПРАЧА ЛЕТЧЫКАЎ-ГЕРОЯЎ І ЧЭЛЮСКІНЦАЎ, Т.Т. СТАЛІН, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, ОРДЖАНІКІДЗЕ, КАЛІНІН, КУЙБЫШЭЎ, АНДРЭЕЎ, ЖДАНАЎ, ЛІТВІНАЎ, ТУХАЧЭЎСКІ, БУДЗЕННЫ, ЧЛЕНЫ ЎРАДА І ЦК ВКП(б), ЛЕПШЫЯ СОВЕЦКІЯ ЛЕТЧЫКІ, МАРАКІ І КУРСАНТЫ КРЭМЛЕЎСКАЙ ШКОЛЫ ЦВК СССР.

ЗА СНЕДАННЕМ СТАРШЫНЯ ЎРАДАВАЙ КАМІСІІ Т. КУЙБЫШЭЎ І ЧЛЕНЫ КАМІСІІ ВІТАЛІ ГЕРОЯЎ СОВЕЦКАГА САЮЗА І ЧЭЛЮСКІНЦАЎ.

МЕНСК РЫХТУЕЦЦА ДА 14-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

Пры Менскім горсавеце створана спецыяльная камісія па падрыхтоўцы да 14-годдзя вызвалення БССР ад белапалякаў.

Святкаванне 14-й гадавіны будзе праведзена, як масавая палітычная кампанія пад знакам азнаямлення шырокіх працоўных мас з міжнародным становішчам СССР, з становішчам рабочага класа і працоўнага сялянства ў капіталістычных краінах. Асноўная ўвага будзе звернута на папулярызацыю дасягненняў, заваяваных працоўнымі БССР пад кіраўніцтвам партыі і пры дапамозе ўрада Совецкага Саюза.

Падрыхтоўчая работа будзе выкарыстана для папулярызацыі важнейшых рашэнняў XVII партз'езда і майскага пленума ЦК КП(б)Б.

З 22 чэрвеня на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах праводзяцца гутаркі, даклады, успаміны ўдзельнікаў.

10 ліпеня ў летнім садзе «Профінтэрн» адбудзецца ўрачысты пленум Менскага гарадскога совета, прысвечаны гадавіне. 11 ліпеня — вялікая масоўка на стадыёне «Дынамо» з выступленнямі ўдзельнікаў вызвалення БССР ад белапалякаў, фізкультурнымі выступленнямі, канцэртам і т. д. 12 ліпеня арганізуецца выхад шэфствуючых арганізацый у лагеры падшэфных часцей.

ЦК Моапра БССР прыўрочвае свой пленум да гадавіны вызвалення БССР ад белапалякаў. Пленум склікаецца ў Барысаве. Лепшай моапраўскай арганізацыі будзе перадан пераходны чырвоны сцяг ЦК. Выпускаюцца жэтоны «Рот фронт», якія будуць названы моапраўскім актывістам.

У Менску арганізуецца вялікая выстаўка, прысвечаная гістарычнай гадавіне.

ПАВЫШЭННЕ ЗАРПЛАТЫ НІЗКААПЛАЧВАЕМЫХ МЕДРАБОТНІКАЎ

Наркамат аховы здароўя БССР і ЦК саюза медсанпрацы выпрацавалі новыя схемы зарплаты для сярэдняга і малодшага медперсаналу на аснове пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «аб падцягненні зарплаты нізкааплачваемым рабочым і служачым у сувязі з павышэннем цэн на нарміраваны хлеб».

Устаноўлены наступныя надбаўкі да зарплаты: для сярэдняга персаналу горада і рабочых пасёлкаў—13 руб. 50 к., вёскі—15 руб., санітарак больніц горада і рабочых пасёлкаў — 20 руб., іншых лекавых устаноў горада—8 руб., больніц і іншых лекавых устаноў вёскі—6 р., малодшага абслугоўваючага персаналу горада—8 руб., вёскі—5 руб.

Скурзавод імя Сталіна выканаў паўгадовае заданне

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу)

Магілеўскі скурзавод імя Сталіна выканаў промфінплан першага паўгоддзя ў грашовым выражэнні на 101,67 проц. Замест вызначаных па плану прадукцыі на 1.952.692 руб. выпушчана на 1.985.305 руб.

АСІНОЎСКІ.

ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ РЭСПУБЛІКІ С. МІХОЭЛЬС З ВУЧАНІЦАЙ 23 МЕНСКАЙ ШКОЛЫ РУБІНАЙ. РУБІНА — УДЗЕЛЬНІЦА НЯДАЎНА ПРАВЕДЗЕНАЙ Ў МЕНСКУ МУЗЫЧНАЙ АЛІМПІЯДЫ.

ШАХМАТЫ І ШАШКІ

УСЕБЕЛАРУСКІ ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫ ТУРНІР—РОЗЫГРЫШ ПЯРШЫНСТВА 1934 г. ІМЯ ГАЗЕТЫ „ЗВЯЗДА"

ВСФК Беларусі пастанавіў правесці шахматна-шашачныя спаборніцтвы з 1 па 24 жніўня 1934 г. Вылучан оргкамітэт па скліканню з'езда: старшыня т. **Пассе**, нам. старшыні тав. **Кузняцоў**, члены т. т. **Стома, Фіялкін, Касперскі і Кейлес.**

На пасяджэнні оргкамітэта 21 чэрвеня пастанавілі прысвоіць турніру імя газеты «Звязда» і зацвердзілі праграму спаборніцтваў. Будзе праведзена чатыры турніры.

1. Шахматны чэмпіянат БССР. Прыме ўдзел 36 ігракоў. Розыгрыш адбудзецца ў два круті: 1) прыпавыя турніры па 6 ігракоў у кожнай, па тры пераможцы ад групы складуць фінал, другі фінал пры ўдзеле 20-22 ігракоў. Пераможцы ў ліку 16 ігракоў складуць шахматную каманду БССР на ўсесаюзныя спаборніцтвы, якія адбудуцца ў кастрычніку 1934 года.

2. Шашачны чэмпіянат БССР. Прыме ўдзел 24 ігракі. Розыгрыш таксама па групах. Па тры пераможцы ад кожнай групы разыграюць фінал. 11 пераможцаў фінала складуць шашачную каманду БССР на ўсесаюзнае спаборніцтва.

Для павышэння кваліфікацыі ігракоў БССР і для ўдзелу ў шахматным і шашачным чэмпіянатах будзе запрошан рад майстроў.

3. Жаночы шахматны чэмпіянат. Удзел прыме 10-12 ігракоў. 1-2 пераможцы будуць вылучаны для ўдзелу ва ўсесаюзным жаночым шахматным чэмпіянаце.

4. Жаночы шашачны чэмпіянат. Прыме ўдзел 10-12 ігракоў.

Падрыхтоўчая шахматна-шашачная работа да спаборніцтваў

Кандыдаты на ўсебеларускія шахматна-шашачныя спаборніцтвы могуць вылучацца выключна па выніках гарадскіх і раённых спаборніцтваў.

Заяўкі з характэрыстыкамі кандыдатаў, табліцамі спаборніцтваў і лепшымі партыямі высылаюцца да 20 ліпеня ВСФК Беларусі—оргкамітэту.

Падрыхтоўчая работа па Менску.

З 25 чэрвеня па 20 ліпеня праводзяцца гарадскія спаборніцтвы. Кандыдаты вылучаюцца пасля спаборніцтваў па прадпрыемствах і ўстановах. Запіс у клубе імя Сталіна ў т. Камянецкага, у ВСФК Бел.—тав. Касперскага і ЦСПСБ, бюро фізкультуры—у сакратара шахматна-шашачнай секцыі т. Кейлеса. Адказнымі за правядзенне менскіх спаборніцтваў оргкамітэт назначыў тт. Сажальчыка і т. Касперскага, майстра Гардона і Камянецкага.

Шахматны матч работнікаў ЦК КП(б)Б з гуртком дома вучоных.

22 чэрвеня ў доме вучоных адбыўся паўторны матч паміж работнікамі ЦК КП(б)Б і гуртком дома вучоных. На гэты раз падрыхтаванасць калектыва ЦК КП(б)Б значна большая і ўжо з самага пачатку іры ачуваецца яго перавага. Матч выіграў калектыў ЦК КП(б)Б.

ШАХМАТНЫ ТУРНІР З УДЗЕЛАМ МАЙСТРАЎ

У другой палове жніўня ў Ленінградзе адбудзецца шахматны турнір з удзелам замежных гросмайстраў Эйве і Кмоха. З совецкіх майстраў прымуць удзел: ад Ленінграда **Алатарцаў, Батвінік, Левенфіш, Лісіцын, Рабінавіч І., Рагозін, Рамзноўскі і Чэхавер.** Ад Масквы: **Кан, Майзель Румін, Юдовіч**, кандыдатамі залічаны **Саліцкі** (Ленінград) і **Белавенец** (Масква).

ПАВЕДАМЛЕННІ

25 чэрвеня у 6 г. веч. у памяшканні Дома партактыва (малая зала) адбудзецца нарада па пытанню ходу конкурса дапамогі чыгуначнаму транспарту. На нараду выклікаюцца трыкутнікі прадпрыемстваў і ўстаноў.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Наступныя таварышы згодна рашэння бюро гаркома КП(б)Б вылучаны дакладчыкамі на палітдзень для менскіх прадпрыемстваў:

Баскін—хлебазавод, **Чарнушэвіч**—паравознае дэпо, **Матусевіч**—малочны завод; **Конік, Жарскі, Карташоў**—завод імя Варашылава; **Варонченка**—абутковая фабрыка імя Кагановіча, **Шараў**—фабрыка «Ўсход», **Клімковіч**—завод «Беларусь», **Клімчук**—трампарк, **Гаршон** — электростанцыя, **Пасюкевіч**—лямпавая фабрыка, **Саак'ян**—фабрыка «Окцябр», **Эгле**—вагоннае дэпо, **Юнг** — завод імя Мяснікова, **Балцін**—завод «Большэвік», **Гурэвіч**—фабрыка «Комунарка», **Сакалевка**—завод «Ударнік», **Сурта**—хімфармзавод, **Хацкевіч**—Белкамунбуд, **Хадасевіч**—друкарня імя Сталіна, **Кудзельскі**—шклозавод, **Абрамаў**—мясакомбінат, **Готфрыд**—завод «Комунар», **Гелгенда** — фабрыка імя Тельмана, **Чорны**—цагельня № 1, **Розін**—завод імя Молатава, **Грыцкевіч**—«Чырвоны хімік», **Іваноў**—служба эксплаатацыі, **Ленцнер**—шчотачная фабрыка, **Джэпкін**—цагельня № 8, **Шулькін**—фабрыка «8 сакавіка», **Фішбейн**—Белдзержбуд, **Кейлін**—цагельня № 1-3, **Галятоўскі**—завод малочных кіслот, **Ошэровіч**—фабрыка «КІМ», **Давідовіч** — цагельня № 2—4, **Задзернюк**—Водаканалтрэст, **Бэр**—пічапінная фабрыка, **Каранеўскі**—«Чырвоны тэкстыльшчык», **Амбражунас**—шпалерная фабрыка, **Кладавікоў** — завод «Пролетарый», **Нольдз**—фабрыка імя Фрунзе, **Сыцько**—цагельня № 5-6, **Валабрынскі** — Менбуд, **Аўгустайціс** — ЦЭЦ, **Герафкер**—«Чырвоны золак», **Кузняцоў**—завод ланцугоў **Галдз, Мінкін**—абутковыя майстэрні.

Нам. сакратара менгаркома КП(б)Б **Хадасевіч.**

26 ЧЭРВЕНЯ Ў 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА Ў ПАМЯШКАННІ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» (СОВЕЦКАЯ, 63) АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА ПА АБГАВАРЭННЮ ПЫТАННЯ АБ АСВАЕННІ РЭВЕНЯ — НОВАГА ВІДУ СЫРАВІНЫ Ў ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

НА НАРАДЗЕ БУДЗЕ ПРАВЕДЗЕНА ДЭГУСТАЦЫЯ (АПРАБАВАННЕ РЭВЕНЯ Ў РОЗНЫХ ВІДАХ ХАРЧОВАЙ ПРАДУКЦЫІ.

УВАХОД ПА ЗАПРАШАЛЬНЫМ БІЛЕТАХ.

РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ».

Памяшк. Дз. Яўр. Тэатра БССР

Гастролі Маскоўскага Дзяржаўнага Яўрэйскага Тэатра

Давід Бергельсон.

24 і 25 чэрвеня У АПОШНІ РАЗ

„МЕРА СТРОГАСЦІ"

(מדה כנגד מדה)

Пачатак у 8 гадз. 30 мін.

Купленыя білеты на сталы месцы сапраўдны.

Астаўшыеся білеты—у рабочай касе і ў касе тэатра.

Памяшканне Белдзяржтэатра

Адкрыццё гастролей Маскоўскага Тэатра Рэволюцыі

26 чэрвеня Адзін адкрыты спектакль А. Н. АСТРОЎСКІ

„ДОХОДНОЕ МЕСТО"

Каждыя ў 5 дзеях.

Пастаноўка народнага артыста рэспублікі В. С. МЕЙЕРХОЛЬДА.

Білеты ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 раб і ў касе тэатра з 12 да 2, і ад 5 да 8.

ГУКАВЫ кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Гукавы мастацкі фільм БАЦЬКА І СЫН

На летняй эстрадзе канцэрты ансамбля ГУСЛЯРОЎ

Кіно Інтэрнацыянал

На экране экстрэнны выпуск саюзкінохронікі СУСТРЭЧА ГЕРОЎ ЧЭЛЮСКІНЦАЎ У МАСКВЕ

Кіно „СПАРТАК"

Ад 20 чэрвеня новая праграма

Менскаму малочнаму заводу

ПАТРЭБНЫ

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР.

СТАРШЫ БУХГАЛТАР.

Маскоўская, 22.

АДКРЫТА ПАДПІСКА

НА ДРУГОЕ ПАЎГОДДЗЕ 1934 г.

НА НАСТУПНЫЯ ВЫДАННІ „РАДИОИЗДАТА"

„ГОВОРИТ СССР"

орган Усесаюзнага камітэта па радыёфікацыі і радыёвяшчанні пры СНК Саюза ССР.

У журнале „ГОВОРИТ СССР" шырока асвятляюцца:

1) пытанні радыётэхнікі, радыё прамысловасці, навукова-даследчай работы, новае радыёбудаўніцтва, студыйная, узлавая і лінейная гаспадарка, новыя тыпы радыёапаратуры, УКВ, тэлевідзенне, гуказапісь;

2) пытанні тэматычнага, мастацкага і навукова-тэхнічнага вяшчання ў тэатры і на мясцах (артыкулы, рэцэнзіі, агляды і г. д.), падрыхтоўка кадраў радыёвяшчання і радыётэхнікі за рубяжом і г. д.

Журнал двухтыднёвы, аб'ём 4 друк. арк. кожны нумар.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 12 мес.—18 руб.
На 6 мес.— 9 руб.
На 4 мес.— 4 руб. 50 к.

Цана асобнага нумара 75 к.

„РАДИО ГАЗЕТА"

орган Усесаюзнага камітэта па радыёфікацыі і радыёвяшчанні пры СНК СССР і камітэта сардэчнасці радыёфікацыі і радыёаматарству пры ЦК ВЛКСМ.

„РАДИОГАЗЕТА" кожныя 6 дзён дае рознастайны матэрыял па пытаннях радыёвяшчання, радыёфікацыі, радыёпрамысловасці і радыёаматарскага руху. „РАДИОГАЗЕТА" знаёміць чытача-слухача з усімі новымі найбольш значнымі перадачамі цэнтральнага вяшчання, з работай радыёзаводаў, радыёкамітэтаў і радыёбуёлаў, з навінкамі радыёапаратуры, радыётэхнікі і г. д.

„РАДИОГАЗЕТА" неабходна кожнаму радыёслухачу.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 12 мес.—12 руб.
На 6 мес.— 6 руб.
На 3 мес.— 3 руб.

Цана асобнага нумара 20 к.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на „РАДИО ГАЗЕТУ" і журнал „ГОВОРИТ СССР" ЗАЎЧАСНА. Тыраж абмежаваны

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў.

Патрабуйце ва ўсіх кіёсках Саюздруку ў гарадах і на станцыях чыг.

УПЕРШЫНЮ дзеці ад 1 года да 13 год У ГУКАВЫМ ГАВАРАШЧЫМФІЛЬМЕ РВАНЫЯ БАШМАКІ

25-VI ў 7 гадзін вечара, у памяшканні Горсовета (К. Маркса, 16, пакой № 32, 2-гі паверх)

адбудзецца

ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ

гандлёва-кааперацыйнай секцыі Менгорсовета разам з кааперацыйным актывам горада.

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Даклад Гартопа аб забеспячэнні палівам на 1934 г.
2. Даклад Горснабя і Плодатрэста аб забеспячэнні плодагароднінай на сельніцтва.
3. Аб міжнародным дні кааперацыі.
Запрашаецца прафактыў.
Яўка членаў Горсовета, кантрольна-лавачных камісій і кааўбюро абавязкова.

Аргаддзел Менгорсовета.

Беларускі сельска-гаспадарчы Інстытут у г. Горках

абвяшчае НАБОР

на трохмесячныя падрыхтоўчыя курсы ў сельска-гаспадарчы інстытут.

Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год.

Заявы прымаюцца да 5 ліпеня 1934 г.

На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй 8 груп дзевяцігодкі, скончыўшыя дзевяцігодку, школу другой ступені, тэхнікумы, рабфакі.

Іспыты ў аб'ёме 8 груп дзевяцігодкі з 1 ліпеня.

Да заявы неабходна прыкласці ўсе дакументы, устаноўленыя НК Асветы для паступаючых у тэхнікумы і ВНУ БССР.

Заявы пасылаць па адрасу: г. Горкі, БССР, Дырэкцыі с-г. інстытута.

Усе прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй наравне з рабфакамі.

Заняткі з 10 ліпеня 1934 г.

Дырэкцыя.

РАБФАК у памяшканні імя 10-годдзя БССР, Любаньск. раёна.

АБ'ЯЎЛЯЕ

АСЕННІ НАБОР НА ЎСЕ 4 КУРСЫ

На 1 курс прымаюцца асобы, якія скончылі 4 групы.

На 2 курс прымаюцца асобы, якія скончылі 5-6 груп.

На 3 курс прымаюцца асобы, якія скончылі ШКМ.

На 4 курс прымаюцца добра скончыўшыя ШКМ і рабфакоў.

Усе студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і ўсімі відамі снабжэння па 1-ай катэгорыі рабочых даных мясцовасці.

Студэнты 4 курса забяспечваюцца стыпендыяй, а студэнтам 1, 2 і 3 курса будзе прадастаўлена работа на вытворчасці.

Заявы прымаюцца да 15 жніўня, іспыты з 15 жніўня да 1 верасня. Да заявы не абходна дадаць наступныя дакументы: анкету, даведку аб соц. становішчы з абавязковым указаннем падатку апошніх 2-х год. для калгаснікаў—аб падатку да ўступлення ў калгас, даведку аб вытворчым стажы, метрыку, пасведчанне аб адукацыі і аб стане здароўя.

Заняткі пачнуцца 1 верасня.

Дырэкцыя.

Сёння, а 7-й гадзіне вечара ў памяшканні Дома партактыва (уваход з вул. Карла Маркса)

адкрываецца

АГУЛЬНА-ГАРАДСКАЯ ВЫСТАЎКА

асартыменту прадукцыі швэйных і абутковых фабрык Менска

Выстаўка будзе працаваць штодзённа з 10 да 12 гадзін дня і з 6 да 9 гадзін вечара.

Усе працоўныя Менска павінны наведваць выстаўку і даць свае заўвагі па прадстаўленым экспанатам.

Менгарком КП(б)Б
Рэдакцыя „ЗВЯЗДЫ".

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Менск, друкарня «Звязды». Упаўн. Галоўлітбела № К—3107